Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 170 (5844) | 26 ліпеня 1937 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Сёння вярнуліся на сваю радзіму героі Совецкага Саюза таварышы ЧКАЛАЎ, БАЙДУКОЎ І БЕЛЯКОЎ.

Гарачае прывітанне сталінскім выхаванцам, героям легендарнага пералёту, доблесным сынам нашай квітнеючай соцыялістычнай радзімы!

ШЫРЫЦЬ СТАХАНАЎСКІ РУХ НА ЎБОРЦЫ ЎРАДЖАЮ

Калгаснікі і калгасніцы, рабочыя соўгасаў і МТС у адзіным імкненні — лепш правесці ўборку, пакрыць шкоду, нанесеную сельскай гаспадарцы ворагамі народу. Расце творчы ўздым мас.

Стаханаўцы Будакашалёўскай МТС—ільнацерабільшчык т. Афанасенка Д. і трактарыст Галіцкі В. на шыроказахватнай ільнацерабільцы, замест сярэдняй нормы ў 4—5 гектараў за змену выцерабілі ільну 18 ліпеня 10,3 гектара, а 19 ліпеня — 15,7 гектара. Тав. Літвінкоў Іван і трактарыстка Кавалёва 17 ліпеня выцерабілі за змену 10 гектараў. Ільнацерабільшчык Горацкай МТС тав. Мачульскі і трактарыст т. Карпіцкі ў калгасе «Большэвік» за два рабочыя дні выцерабілі 24 гектары ільну.

Машыніст на коннай жнярцы т. Адамовіч Васіль, з калгаса «Першае мая», Гатаўскага сельсавета, Менскага раёна, замест нормы ў 4 гектары зжынае па 8,5 гектара, а машыністы тт. Дзенісевіч, Іваноўскі і Філіповіч, з арцелі «Пабеда», Папярнянскага сельсавета, зжынаюць па 7—8 гектараў. Машыніст т. Давыдоўскі, які працуе на жнярцы ў соўгасе імя Леніна, Бабруйскага раёна, замест нормы ў 4 гектары зжынае па 12—14 гектараў за сваю змену

Сёння мы друкуем паведамленне майстра камбайнавай уборкі Дзержынскай МТС т. Шумскага, які замест нормы ў 180 гектараў у сезон абавязаўся на паўднёвым камбайне ўбраць 500 гектараў. У першыя-ж дні работы т. Шумскі замест дзённай нормы ў 8 гектараў убірае па 11—12 гектараў.

Рады стаханаўцаў на ўборцы ўраджаю раступць. Прыкладаў стаханаўскай працы можна было-б прывесці значна больш. Усе яны сведчаць аб адным: да канца адданыя большэвіцкай партыі, справе соцыялізма, калгаснікі, рабочыя соўгасаў поўны жадання і гатоўнасці хутчэй і без страт сабраць ураджай, узорна выканаць свае абавязкі перад дзяржавай, яшчэ больш заможным зрабіць жыццё калгаснікаў. Трэба толькі ўзначаліць стаханаўскі рух на ўборцы. Ад асобных стаханаўскіх рэкордаў перайсці да стабільных, цвёрдых, высокіх паказальнікаў работы, пашырыць вопыт стаханаўцаў ва ўсе звенні, брыгады, калгасы і соўгасы, каб забяспечыць поспех уборкі, заваяваць права найбольшаму ліку калгасаў, соўгасаў, перадавікоў сельскай гаспадаркі, спецыялістаў прымаць удзел ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1938 года.

Прыклады будакашалёўскіх ільнацерабільшчыкаў, перадавых машыністаў жнярак і майстроў камбайнавай уборкі ўраджаю паказваюць, што дае тэхніка, калі адносіцца да работы добрасумленна. Гэтыя прыклады сапраўды варты перайняння. Яны вучаць, як трэба выкарыстаць сельскагаспадарчыя машыны на ўборцы ўраджаю, якімі аснашчаны нашы МТС, калгасы і соўгасы.

Якімі мізэрнымі і нікчэмнымі на фоне прыведзеных толькі некаторых паказальнікаў стаханаўцаў сельскай гаспадаркі выглядаюць усякія спвярджэнні аб «гранічнасці» ў выкарыстанні сельгасмашын. Няма патрэбы даказваць, што палобнага роду балбатня і дзейнасць выражаюць сабой антымеханізатарскія настроі і практыку шкодніцкага ахвоспя з банды трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх шпіёнаў, дыверсантаў, арудаваўшых у зямельных органах, калгасах, соўгасах і яшчэ канчаткова не выкараненых алтуль.

Яшчэ і зараз можна сустрэць нямала фактаў спроб ворагаў разбурыць машынны парк у сельскай гаспадарцы, выводзіць са строю трактары, камбайны і іншыя сельгасмашыны, каб не дапусціць іх да ўборкі ўраджаю. Разлікі ворагаў тут просты. Яны імкнуцца перашкодзіць уборцы ўраджаю і стварыць затрудняльнае становішча ў калгасах і соўгасах.

У Расонскай МТС зусім нядаўна мелі месца факты, калі ў каробках хуткасней шасці трактараў былі знойдзены гайкі, балты і іншыя жалезныя рачы. У каробцы хуткасці трактара, на якім працуе трактарыстка Савельева, знойдзены ключ і болт. Дырэкцыя МТС (дырэктар тав. Цухло), замест таго, каб выявіць шкодніка, прабавала тлумачыць гэты факт «выпадковасцю». Тым часам механік МТС па рамонту трактараў Васілеўскі, як толькі выявіўся гэты факт, кудысці таямніча знік.

Зараз толькі выяўлена, што рамонт многіх сельскагаспадарчых машын, і ў прыватнасці малатарняў, у Кіраўскім раёне праведзен па-шкодніцку. Механік МТС па сельгасмашынах—сын кулака Боленкоў, які ўжо раз судзіўся за шкодніцтва і быў прыслан у МТС з вылатнай характарыстыкай ворага народу шпіёна Бенека, з прычыны добрадушнасці кіраўніцтва працуе яшчэ і зараз у МТС.

Ці не дастаткова толькі гэтых фактаў, каб пераканацца, што шкодніцкае ахвосце працявае сваю разбуральную дзейнасць.

Нельга таксама лічыць выпадковасцю вялікія прастоі і ігнараванне машын у Круглянскім раёне, дзе ў большасці калгасаў выбіраюць лён рукамі, у той час як 15 ільнацерабілак скарыстоўваюцца дрэнна; у Барысаўскім раёне таксама многа прастойвае сельгасмашын і дапускаюцца страты ўраджаю.

Зусім зразумела, што такое становішча сельгасмашын і антымеханізатарскія настроі ў гэтых раёнах сведчаць, што тут не выкарчаваны да канца шкоднікі, не ліквідаваны вынікі іх разбуральчай дзейнасці. Кіраўнікі гэтых раёнаў, якія, відаць, усё яшчэ хварэюць на ідыёцкую хваробу—бяспечнасць, да гэтага часу не прынялі мер, каб арганізаваць поўнае выкарыстанне на ўборцы ўраджаю камбайнаў, жнярак, ільнацерабілак і т. д., разгарнуць стаханаўскі рух за найбольшую норму выпрацоўкі гэтых машын.

Асабліва трэба адзначыць дрэнную арганізацыю і беспарадкі ва ўборцы ўраджаю ў Бабруйскім раёне, дзе пануе неарганізаванасць, прастойвае многа машын, дапускаюцца страты ўраджаю. Незразумела—чаму сакратар Бабруйскага райкома КП(б)Б тав. Вайнман, старшыня РВК т. Цітавец праяўляюць такую бясклопатнасць да надстолькі важнай справы, як уборка ўраджаю.

Выключнай бясклопатнасцю, мяжуючай са злачынствам, трэба тлумачыць той факт, што ў гэтых і многіх іншых раёнах не спынены і да апошняга дня страты ўраджаю. Не арганізавана ахова ўраджаю ад раскрадвання ў сушрошь пажараў. А гэтым і карыстаюцца шкоднікі, якія наўмысля знішчаюць ураджай.

Не абышлося відавочна без шкодніцтва ў калгасе імя БВА. Любаньскага раёна, дзе гэтымі днямі згарэлі два стагі жыта, па вестках, ад падпалу.

Трэба нарэшце пакончыць з такімі злачыннымі адносінамі да барацьбы з стратамі, да аховы ўраджаю.

З кожным днём аб'ём работ на ўборцы пашыраецца, а тэмпы ўборачных работ у параўнанні з выспяваннем хлябоў у большасці раёнаў з'яўляюцца нездавальняючымі. Для паўднёвых раёнаў рэспублікі, трэба сказаць, ужо цяпер стварылася вельмі сур'ёзная пагроза алставання, калі неадкладна не будуць прыняты меры для ўзмацнення тэмпаў уборкі.

Побач з няўбранымі яшчэ азімымі ў многіх раёнах выспелі і выспяваюць яравыя культуры. Цяпер, як ніколі, неабходна выкарыстанне ўсіх сіл і сродкаў, каб узмацніць тэмпы ўборкі. У нашай рэспубліцы ёсць дзесяткі перадавых калгасаў, якія скончылі жніво азімых, паспяхова ўбіраюць яравыя, ужо разлічыліся поўнасцю па збожжапастаўках з дзяржавай і пачалі выдачу авансам збожжа на працадні калгаснікам у размеры ад 10 да 15 проц. да фактычнага абмалоту.

Вопыт гэтых калгасаў, а таксама высокія паказальнікі выпрацоўкі стаханаўцаў на ўборцы, эфектыўнага выкарыстання імі сельскагаспадарчых машын, паказваюць, што ёсць усе магчымасці ўзмацніць тэмпы, скараціць тэрміны ўборкі, унікнуць малейшых страт пры ўборцы ўраджаю.

Узоры работы ільнацерабільшчыкаў Будакашалёўскай МТС—тт. Афанасенка, Літвінкова, трактарыстаў Галіцкага і Кавалёвай павінны ведаць усе калгаснікі, рабочыя МТС і соўгасаў. Вылатныя прыклады пакуль яшчэ нямногіх стаханаўцаў на ўборцы павінны ператварыцца ў шырокі стаханаўскі рух ва ўсёй сельскай гаспадарцы рэспублікі.

Стаханаўцы палёў, майстры камбайнавай уборкі, знатныя трактарысты, нашы ордэнаносцы, якія ў мінулых гадах паказалі ўзоры соцыялістычнай працы, павінны ў гэтым годзе даць яшчэ лепшыя вынікі, перакрыць леташнія паказальнікі.

с. 28

ЯНЫ ПЕРШЫМІ АЖЫЦЦЯВІЛІ МАРУ ЧАЛАВЕЦТВА

Горача вітаем сталінскіх выхаванцаў, якія вяртаюцца на родную совецкую зямлю—Чкалава, Байдукова і Белякова.

Першымі ў гісторыі ажыццявілі яны заветную мару чалавецтва, злучыўшы найкаракейшай надземнай дарогай дзве вялікія краіны—Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Злучаныя Штаты Амерыкі.

Трыумфальны фініш совецкага паветранага карабля блізка ад Портланда яшчэ раз прадэманстраваў перад усім светам веліч соцыялістычнай дзяржавы, удасканаленасць совецкай тэхнікі і беззаветную адвагу нашых людзей, поўных гарачай любві да выдатнай радзімы.

Не выпадковасць забяспечыла бліскучую перамогу над суровай прыродай, а большэвіцкая арганізаванасць, яснасць пастаўленай мэты.

Зусім нядаўна большэвікамі быў пераможан Паўночны полюс а ў хуткім часе першыя жыхары полюса весткамі аб надвор'і ў цэнтры Палярнага басейна падрыхтавалі поспех пералёту Чкалава, Байдукова, Белякова. Не адгучэлі яшчэ воклічы захаплення іхнім подвігам, а над полюсам, над халоднымі морамі Арктыкі прамчаўся самалёт Громава, Юмашова, Даніліна, чые імёны зараз на вуснах прапоўных усяго свету.

Няма мяжы адвазе Совецкай краіны і яе слаўных сыноў! Явай становяцца ўчарашнія мары, і пераможная прырода пачынае служыць чалавецтву, на карысць якога нястомна працуюць народы совецкай зямлі, комуністычная партыя і лепшы друг працоўных таварыш Сталін.

Героі Совецкага Саюза

І. СПІРЫН.
М. ШЗВЕЛЕЎ.
М. СЛЕПНЕЎ.
М. БАБУШКІН.
П. ГАЛАВІН.

ПРЫВІТАННЕ ПРАЦОЎНЫМ БЕЛАРУСІ

Мы зноў на роднай зямлі нашай вялікай соцыялістычнай Радзімы. Непередаваема пачуццё нашай радасці: мы выканалі сталінскае заданне.

Адсюль, з граніцы з капіталістычным Захадам, мы шлем праз газету „Звязда" гарачае прывітанне працоўным ордэнаноснай Совецкай Беларусі—надзейнага фарпоста вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Героі Совецкага Саюза **В. ЧКАЛАЎ, Г. БАЙДУКОЎ, А. БЕЛЯКОЎ.**

Ст. Негарэлае

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, МАЯ ДАРАГАЯ РАДЗІМА!

МІТЫНГ У НЕГАРЭЛЫМ

НЕГАРЭЛАЕ. (Ад наш. спец. кар.). Яшчэ задоўга да прыходу поезда вакзал быў упрыгожан выключна ўрачыста. Вялікае свята адчувалася. Рабочыя, пагранічнікі, госці Менска і прылятаючых калгасаў хадзілі ўзбуджанымі радасцю чакаемай сустрэчы з Героямі Совецкага Саюза Чкалавым, Байдуковым, Беляковым, чыя слава горда прагрымела па ўсяму свету.

Урачыста калышуцца чырвоныя палотнішчы, на якіх выразнымі літарамі напісаны лозунгі любві да партыі, таварыша Сталіна, гордых совакаў нашай радзімы тт. Чкалава, Байдукова і Белякова. У роўным страі стаяць зялёныя хвоі. Трыбуна ўпрыгожана рознакаляровымі кветкамі. Над ёю кветкамі рэзее лозунг: «Чкалаву, Байдукову, Белякову—пагранічнае прывітанне».

Вакзал заліты яркім святлом. Узрушана мітусяцца журналісты, фотарэпарцёры, кіноаператары, работнікі радыёперадачы з першай пагранічнай станцыі. Усюды, дзе людскі натоўп у роўным страі чакае дарагіх герояў,—мора кветак, яркіх, выразных...

Палова першай гадзіны ночы... Радаснае хваляванне ўсё больш і больш ахапляе прысутных на пероне. Насустрач поезду да самай граніцы на ст. Коласава выязджаюць старшыня ЦВК БССР т. Стакун, рэдактар «Звязды» т. Юркоў, карэспандэнт «Праўды» ордэнаносец т. Бронтман.

Астаюцца лічаныя хвіліны да прыходу норд-экспрэса. Напружанасць нарастае... Робіцца апошнія падрыхтаванні. У ганаровай варце—лепшыя пагранічнікі атрада.

Вось праз млявую цемень прарэзваецца паравоз, а за ім плаўна бягуць па рэйках вагоны. Гукі авіяцыйнага марша плывуць далёка, далёка.

У адным з вагонаў хутка вырысоўваюцца постаці знаёмых па абліччу любімых герояў... Усе пазнаюць простага, чалавечнага Чкалава. Ён ідзе наперадзе як гордасць і слава сталінскіх сокалаў, гордасць і слава нашага народу. За ім—Байдукоў і Белякоў. Твары іх гарэць шчаслівай усмешкай, невыказнай радасцю. Яны ўсхвалёваны. Разам з тав. Траяноўскім, з сакратарамі ЦК КП(б)Б, тт. Дзеніскевічам і Патапейка, старшынёю ЦВК БССР т. Стакуном, членамі ЦК партыі і ўрада, яны праходзяць да трыбуны. Воклічы прывітанняў. Гукі аркестра, крыкі «ўра», кветкі,—усё зліваецца ў мілагучную сімфонію радасной, бяскрайняй ўрачыстасці сустрэчы. Трыбуна тоне ў кветках. З-за іх не відаць герояў.

Ля мікрафона—сакратар ЦК КП(б)Б т. Дзеніскевіч.

— ЦК КП(б)Б, урад Беларускай рэспублікі, увесь вольны беларускі народ на совецкай зямлі горача вітае слаўных герояў Чкалава, Байдукова і Белякова,—гаворыць ён.

— Увесь совецкі народ з затоеным хваляваннем пільна сачыў за гэтым бясстрыкладным у гісторыі пералётам, які паказаў нашу тэхнічную магутнасць, які высока падняў славу нашай любімай радзімы,—прадаўжае сваю прамову т. Дзеніскевіч.

Зноў сыплюцца кветкі, зноў радасныя воклічы, зноў гукі аркестра.

— Таварышы Чкалаў, Байдукоў і Белякоў,—гаворыць далей тав. Дзеніскевіч,—бліскуча выканалі сталінскае заданне. Беларускі народ будзе браць прыклад у тт. Чкалава, Байдукова і Белякова, як праяўляць гераізм тут, на рубяжы з капіталістычным Захадам, як павышаць сваю рэвалюцыйную пільнасць, каб да канца выкрываць і знішчаць ворагаў народу, як весці далейшую барацьбу за новыя поспехі соцыялістычнага будаўніцтва і ўмацавання абароны Саюза ССР.

Апошнія словы прамовы т. Дзеніскевіча—«Няхай жывуць нашы слаўныя гордыя сокалы», «Няхай жыве той, хто выхоўвае сталінскіх багатыроў,—наш любімы Сталін»—пакрываюцца магутнымі воклічамі, раскатным «ура», гукамі «Інтэрнацыянала».

Затым слова атрымлівае старшыня ЦВК БССР т. Стакун, які гаворыць:

— Таварышоў Чкалава, Байдукова і Белякова вітаю і віншую ад імя ўрада БССР. Амаль пяць стагоддзяў лепшыя розумы чалавецтва марылі аб адкрыцці Паўночнага шляху і даследванні Паўночнага полюса. Але гэтага нікому не ўдавалася зрабіць. Толькі наша краіна пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна здолела вырашыць гэту праблему за якіх-небудзь дзесят гадоў. Подвіг Чкалава, Байдукова і Белякова застанецца незабытым у вяках. Яны прадэманстравалі гераізм і магутнасць Краіны соцыялізма, паказалі свету перавагу нашай тэхнікі над тэхнікай капіталістычных краін. Калі фашызм накіроўвае тэхніку на прыдушэнне прыгнечаных народаў, то ў нас тэхніка служыць праграсу чалавецтва, служыць шчасліваму народу.

— Слава героям з герояў!—заканчвае т. Стакун.

Ад слаўных пагранічнікаў Герояў Совецкага Саюза вітае тав. Бічаўскі. Яго выразная, яркая прамова ўзбуджае прысутных на мітынгу. Ён гаворыць:

— Калі пад снежнымі прасторамі Арктыкі, Паўночным полюсам, полюсам непрыступнасці ваш матор спяваў пераможныя песні Краіны соцыялізма, мы гатовы былі ў любую хвіліну аддаць вам сваю кроў, каб матор не спыняў гэтай песні. І таму вы перамаглі...

Валерый Паўлавіч Чкалаў падыходзіць да мікрафона. Яму прадастаўлена слова. Ён гаворыць адрывіста, кароткa, проста і хвалююча:

— Адно тое, што мы знаходзімся на Совецкай зямлі, напаўняе нашы сэрцы радасцю. Мы выканалі сталінскае заданне, пройдзен Сталінскі маршрут № 2. Мы перамаглі таму, што за намі ўвесь многамільённы совецкі народ. Ні пурга, ні завеі, ні вятры і цыклоны не маглі нас звярнуць са сталінскага шляху, таму што мы зварочваць з гэтага шляху не маглі і не ўмеем. Мы гатовы да новых перамог, да новых шляхоў. Таварышу Сталіну—ура!

Роскатныя і пераможныя воклічы, гукі «Інтэрнацыянала» пакрываюць перон і нясуцца далёка, далёка па ўсёй нашай радзіме, і туды—да граніцы, дзе пад ярмом панскай Польшчы стогне падняволены народ. Эфір перадае па ўсёй краіне ўрачыстасць радаснай сустрэчы.

Цёпла, радасна сустракаюць прысутныя выступленне Героя Совецкага Саюза тав. Байдукова.

— Пералёт, які мы ажыццявілі,—гаворыць т. Байдукоў,—з'яўляецца вялікім дасягненнем нашай авіяцыйнай прамысловасці. Наш самалёт зрабіў два вялікія пералёты, і свет віншуе нас заслужана з перамогай. У Амерыцы нас цёпла сустрэлі, што вылілася ў вялікую дэманстрацыю дружбы двух народаў. Мы праехалі палову свету, каля 20 тысяч кілометраў. Паездка паказала, што існуюць два светы—багатых і бедных. Мы бачылі роскат на адным баку і галечу на другім, бачылі негрыцянскі харалем, малалетнюю прастытуцыю, голад і бязвыхаднасць.

— Ворагі нашага народу хацелі зрабіць і ў нас два светы, але краіна адсекла іх крывавыя рукі. Нікому не ўдасца адняць у народаў СССР заваёванага шчасця.

Я, бачыўшы два светы — раскош і галечу і ведаючы замыслы ворага, заклікаю вас, таварышы, да пільнасці.

Бурнымі апладысментамі прапоўныя пакрываюць выдатныя заключныя словы прамовы тав. Байдукова—«Добры дзень, мая дарагая радзіма!».

На трыбуне—Герой Совецкага Саюза тав. Белякоў.

— У пачатку ліпеня,—кажа ён,— у Атлантычным акіяне знікла вядомая амерыканская лётчыца Эмілія Эрхарт. Чаму яна загінула? Таму, што яе палёт быў арганізован капіталістычным светам, таму што там лётчык-герой прадастаўлен сам сабе і ніхто аб ім не клапоціцца.

Нашы два пералёты прайшлі бездакорна. Мы жывем у Краіне соцыялізма і ідзем па Ленінска-Сталінскаму шляху. Наш пералёт з'яўляецца дэманстрацыяй дасягненняў аэранавігацыйнай навукі, якая вырасла разам з авіяцыйнай навукай.

Няхай жыве той вялікі чалавек, які паказвае нам правільны шлях жыцця і перамог!

Няхай жыве нарком абароны таварыш Варашылаў!

... Урачысты мітынг кончан. Акружаны поўным захаплення натоўпам, усхвалёваная цёплай і радаснай сустрэчай, гераічная тройка накіравалася да совецкага поезда.

Яшчэ доўга на пероне грымелі крыкі «ўра», не сціхалі воклічы прывітанняў у гонар слаўных сыноў радзімы, у гонар таго, хто выхаваў іх, у гонар таварыша Сталіна.

Да адыходу поезда працоўныя і пагранічнікі стаялі ля вокнаў вагона і гутарылі з героямі-лётчыкамі. Сотні рук працягваюць праз вокны кавалачкі паперы, просяць у герояў іх аўтографы. Чкалаў, Байдукоў і Белякоў не паспяваюць да адыходу поезда задаволіць усіх жадаючых атрымаць аўтограф подпіс герояў на ўспамін.

Поезд крануўся. Махаючы рукамі, героі ветліва развітваюцца з прапоўнымі і пагранічнікамі, з грамадзянамі краіны Совецкай, якія прышлі сустрэць адважных сталінскіх выхаванцаў на совецкай зямлі.

П. КАВАЛЁЎ.
С. ГАЛКІН.

НА КРЫЛЛЯХ НАШЫХ САМАЛЁТАЎ МЫ ПАНЯСЁМ ДАЛЕЙ І ВЫШЭЙ СЛАВУ СВАЁЙ РАДЗІМЫ

МІТЫНГ У МЕНСКУ

Палова чацвертай гадзіны раніцы. Прапоўныя Менска прышлі на ўпрыгожаны перон сустракаць Герояў Совецкага Саюза—тт. Чкалава, Байдукова і Белякова, імёны якіх сталі блізкімі і роднымі ўсяму беларускаму народу.

Цяжка было паверыць, што такі позны час. Ноч схавалася, прыталася ад яркага электрычнага святла. Усюды—урачыстасць. Мора спягаў, кветак. Уверсе, над вакзальным будынкам—велізарнае панно пералёту Масква—Паўночны полюс—Паўночная Амерыка, з вялікім партрэтам любімага Сталіна і партрэтамі Чкалава, Байдукова і Белякова.

Па ўсім шырокім пероне размясціліся калоны рабочых і прапоўных сталіцы ордэнаноснай Беларусі. Наперадзе—студэнты ордэнаноснага Інстытута фізкультуры. Моцныя загаралыя юнакі і дзяўчаты. Усе яны трымаюць вялікія букеты яркіх і прыгожых кветак.

Пад гукі «Інтэрнацыянала», радасныя воплескі, цёплыя позіркі прапоўных поезд падыходзіць да перона. Заўважыўшы тт. Чкалава, Байдукова і Белякова, людское мора заварушылася, ажыло. Хваля натоўпу рушыла да трыбуны. Кожны жадае абняць іх і моцна паціснуць іх мужныя рукі. Радасці няма канца. Адважную тройку совецкіх патрыётаў на руках нясуць да трыбуны.

Магутным раскацістым громам гучаць словы прывітання таму, хто вядзе нашу краіну ад перамогі да перамогі, хто дбайна вырошчвае адважных і мужных лётчыкаў,—таварышу Сталіну.

— Беларускі народ віншуе Героя Совецкага Саюза, якія сваім бясстрыкладным пералётам яшчэ больш узвысілі славу нашай соцыялістычнай радзімы. Беларускі народ ганарыцца вамі, доблеснымі сынамі вялікага народу, выхаванцамі любімага Сталіна,—гаворыць адкрываючы мітынг сакратар ЦК КП(б)Б т. Дзеніскевіч.

— Няма слоў, каб перадаць тую вялікую радасць, тое неапісальнае пачуццё хвалявання, якое мы адчулі тут, на тэрыторыі ордэнаноснай Беларусі, калі ўступілі на нашу совецкую зямлю,—гаворыць т. Чкалаў. — Мы ганарымся сваім выдатным пералётам. Але ніколі мы не забываем таго, што сталінскія сокалы могуць лятаць яшчэ вышэй, яшчэ далей, чым яны лятаюць цяпер. На крыллях нашых самалётаў мы панясем далей і вышэй славу сваёй соцыялістычнай радзімы. Мы свабодны, і ўсе перашкоды знішчым. Бо працуем разам з вамі, разам з усім народам і таварышам Сталіным. З вамі, з таварышам Сталіным мы раздзялялем нашу агульную радасць. — Ура таварышу Сталіну!—усклікае таварыш Чкалаў.

На цэнтр трыбуны ўваходзіць легендарны лётчык, майстар «сляпых» палётаў, выдатны штурман, таварыш Георгій Байдукоў.

— Прыношу ўдзячнасць беларускаму народу за цудоўную і ветлівую сустрэчу, якую мы адчуваем, уступіўшы на зямлю нашай соцыялістычнай маперы-радзімы.

Разам з вамі, народам, які нас выраспіў, мы радуемся ўрачыстасці совецкай авіяцыі. Вы прышлі сюды, каб разам з намі раздзяляць радасць нашай перамогі. Дзякуй вам, дарагія, за сустрэчу, за любоў і клопаты аб нас.

Герой Совецкага Саюза штурман Аляксандр Белякоў сваю шчырую прамову пачаў з апавядання пра пералёт.

— Мы ляцелі, — гаворыць ён, — з Масквы цераз Паўночны полюс у Паўночную Амерыку 63 гадзіны. З Амерыкі-ж да першай станцыі Саюза ССР мы плылі і ехалі больш 630 гадзін. Мы, дарагія таварышы, засумавалі па сваёй вялікай радзіме, па свайму магутнаму народу. Мы шчаслівы, што ўся рабочая і калгасная Беларусь прышла раздзяляць разам з намі, разам з усімі народамі нашай краіны нашу перамогу. Няхай жыве той, хто вядзе ўсіх нас да новых перамог, наш любімы, наш дарагі Сталін!!

Высока падняліся спягі. Громкія воклічы прывітанняў і ўдзячнасці напоўнілі начную пітыню, прабудзілі горад.

Развітваючыся з дарагімі братамі. Героямі Совецкага Саюза, старшыня ЦВК БССР тав. Стакун яшчэ раз перадае гарачае большэвіцкае прывітанне ім ад беларускага народу.

Фізкультурнікі ордэнаноснага інстытута, акружыўшы герояў, засыпаюць іх кветкамі і вітаюць трохразовым фізкультурным «ура». Таварышы Чкалаў, Байдукоў і Белякоў накіроўваюцца да вагона. За імі на развітанне прапоўныя нясуць букеты прыгожых пахучых кветак. Тав. Чкалаў, махаючы рукой, заходзіць у вагон. Старшыня ЦВК БССР моцна абнімае яго і цалуе. Усхвалёваны герой развітваецца з працоўнымі сталіцы ордэнаноснай Беларусі.

Шчаслівай дарогі, таварышы!

Сёння поезд з Героямі Совецкага Саюза — тт. Чкалавым, Байдуковым, Белякоўым і паўпрэдам СССР у Злучаных Штатах Амерыкі тав. Траяноўскім адышоў у Маскву.

ПЕРАЛЁТ ЗДЗІВІЎ УВЕСЬ СВЕТ

(ГУТАРКА З ПАЎПРЭДАМ СССР У ЗША ТАВ. ТРАЯНОЎСКІМ)

Учора, разам з героямі Совецкага Саюза тт. Чкалавым, Байдуковым і Беляковым, у Совецкі Саюз прыехаў паўпрэд СССР у ЗША тав. Траяноўскі.

У гутарцы з супрацоўнікам «Звязды» аб уражаннях, пакінутых бліскучым пералётам тт. Чкалава, Байдукова і Белякова на грамадскую думку Злучаных Штатаў Амерыкі, т. Траяноўскі сказаў наступнае:

— Сустрэча нашых слаўных герояў, зрабіўшых упершыню ў гісторыі чалавецтва здзіўляючы пералёт з Совецкага Саюза ў ЗША праз Паўночны полюс, насіла шырокі грамадскі характар і суправаджалася вялікім энтузіязмам. Гэты пералёт адкрыў вочы амерыканцам на тыя велізарныя дасягненні, якія мае наша краіна, на тыя цудоўныя магчымасці прагрэсу, якія стварае сталінская эпоха.

Вялікі інтарэс да пералёту праявілі авіяцыйныя колы, якія бачылі ў поспеху нашых герояў бліскучыя перспектывы далейшага росту авіяцыйнай тэхнікі. Яны добра разумеюць, што дасягненні Чкалава, Байдукова і Белякова з'яўляюцца вялікім укладам у справу развіцця авіяцыі ўсяго свету.

Поспех нашых герояў выклікаў надзеі зацікаўленых колаў, убачыўшых у ім рэальныя перспектывы злучэння ЗША з Совецкім Саюзам найкарацейшым шляхам. Яны лічаць гэты шлях цалкам рэальным і ажыццявімым, асабліва пасля таго, як першы пералёт быў падмацован выдатным палётам тт. Громава, Юмашова і Даніліна. Яны пераканаліся, што сувязь СССР з ЗША праз Паўночны полюс не з'яўляецца выпадковай справай адважных герояў, а вынікам усёй работы Совецкага Саюза па заваяванню Арктыкі. Цвёрдасць і настойлівасць, якія праяўляе наша краіна ў справе авалодання і канчатковага асваення Поўначы, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, здзіўляе ўвесь свет і прымушае яго верыць у далейшае пераможнае развітё гэтай велізарнай справы.

ВІТАЕМ СТАЛІНСКІХ ВЫХАВАНЦАЎ

БАРЫСАЎ, 25 ліпеня. (БЕЛТА). На прадпрыемствах горада адбыліся мітынгі ў сувязі з вяртаннем на радзіму Герояў Совецкага Саюза, слаўных лётчыкаў Чкалава, Байдукова і Белякова.

— Мы ганарымся сталінскімі выхаванцамі—вернымі патрыётамі нашай радзімы,—заявіў на мітынгу стахановец дасазавода імя Молатава т. Аўчук.—Перамога нашых герояў з'яўляецца яшчэ адным ударам па фашысцкіх падпальшчыках вайны. Мы ўсе ўпэўнены, што калі вораг асмеліцца парушыць нашы граніцы, ён атрымае сакрушаючы ўдар.

— Сваім пералётам,—пішуць у сваёй рэзалюцыі рабочыя фанернага завода № 25, — героі-лётчыкі даказалі ўсяму свету, на што здольны сыны нашай вялікай радзімы. Няхай жывуць гераічныя сталінскія сокалы!

ЭКІПАЖ ЛЕГЕНДАРНАГА САМАЛЕТА

МАИСТАР СЛЯПОГА ПАЛЕТУ

«Асабістае кіраўніцтва экіпажам з боку Ўрада і таварыша Сталіна выпрацавала за гэтыя годы ў нас самае галоўнае ў свядомасці, што ўсе такія вялікія справы совецкі лётчык робіць, хаця і па сваёй ініцыятыве, але ад імя ўсяго многамільённага народу. Несці на крыллях гонар усяго народу — гэта вялікая і адказная задача патрабавала выключна сур'ёзнага падыходу да пералёту, і асабліва такога, як праз Паўночны полюс».

Так піша ў сваіх запісках лётчыка - штурмана «Наш палёт у Амерыку», другі пілот адважнай тройкі герояў, якія ўпершыню ў гісторыі чалавецтва звязалі два матэрыкі праз Паўночны полюс, — Герой Совецкага Саюза Георгій Байдукоў. Несці гонар многамільённага совецкага народу і адначасова адчуваць на сабе бацькаўскую любоў і клопаты гэтага народу, любоў і клопаты вялікага чалавека, правадыра і настаўніка працоўных Совецкага Саюза тав. Сталіна—гэта тое, чым моцны совецкія лётчыкі, здзіўляючыя ўвесь свет сваім геройствам, майстэрствам і адвагаю.

У слаўнай когорце гордых совецкіх сокалаў Байдукоў займае даволі скромнае месца — лётчыка-выпрабавальніка. І пасля славутага палёту гэтай адважнай тройкі па Сталінскаму маршруту і да апошніх дзён палёту ў Злучаныя Штаты Амерыкі праз Паўночны полюс яго не ўскружыла прагрымеўшая слава, ён да канца астаўся і ёсць скромным і простым совецкім чалавекам, старанна працуючым на адным з адказных участкаў сацыялістычнага будаўніцтва. Яго знадворны выгляд таксама нічога не гаворыць аб «усемагутным герое» з буржуазнага пункту гледжання.

«Няма ў Байдукова ні сакалінага позірку, ні ганаровай гэтакай заліхвацкай выпраўкі, ні паказной барабаннай смеласці, ні позы, ні велічных жестаў, ні агнявых вачэй, — расказвае аб ім Барыс Гарбатаў. — Ён — скромны, ціхі, прапавіты чалавек, крыху сутулаваты, крыху пальсеўшы. Калі ён апранаецца ў штацкае адзенне, у ім ніхто не падазрае лётчыка. Ён вельмі задаволен гэтым. Ён лабрадушна пасмейваецца».

Штурман і пілот — вось яго нязменнае месца сярод слаўнага экіпажа «АНТ-25». Але гэтым роля Байдукова не вычэрпваецца. Яго заслужана і па праву называюць майстрам сляпога палёту. «Нашаму Ягору весялей ляцець, калі ён апрача прыбораў нічога вакол сябе не бачыць», — не адзін раз жартліва заўважалі пра яго Чкалаў і Белякоў. І зусім зразумела, чаму гераічны экіпаж давяраў Байдукову весці чырвонакрылага красуня ў самых цяжкіх метэаралагічных умовах.

— Мы запакаваны ў двайную каробку, — расказвае Байдукоў у запісках лётчыка-штурмана пра начны палёт над Ціхім акіянам. — Адна каробка — суцэльныя хмары з ледзяной крупой, другая — доўгая паўднёвая ноч. Разам яны даюць поўную ізаляцыю ад святла.

У такой каробцы Байдукоў вядзе даклада самалёт па курсу. З такой шчыльнай каробкі густых арктычных хмар яму не адзін раз даводзілася вырываць самалёт, каб унікнуць смяртэльнага абледзянення. Пасля такой упартай барацьбы з дзікімі сіламі прыроды наступала унутранае задаволенне, і Георгій любуецца нямымі арктычнымі пейзажамі.

— Добра цяпер займацца паэзіяй, — гаворыць ён, — а вось тры гадзіны ўпартай барацьбы з апошнім цыклонам Арктыкі зусім не выклікалі настрою да разважанняў аб прыгожасці.

Патрэбны былі сапраўды гераічныя патугі, каб весці дакладна па курсу паветраны карабель, каб па прыладах арыентавацца ў непраўдзівым масіве хмар з градам і дажджом, каб ляцець наперакор бушуючым арктычным ветрам. Але тым больш гераічным, выдатным і быў гэты пералёт, што ён праходзіў над прасцягамі, якія з часу нараджэння зямлі не абуджаліся ні чалавечым голасам, ні шумам прапелера.

У Байдукова за плячыма ўжо быў немалы вопыт сляпых палётаў. Год таму назад гэты-ж экіпаж на гэтым-жа самалёце імчаўся над совецкай Арктыкай з Масквы на Ўсход. Умовы пералёту былі не лепшыя. Тая-ж палярная стыхія на кожнай сотні кілометраў рыхтавала самыя рызыкоўныя нечаканасці. У артыкулах, успамінах Герояў падрабязна апісан гэты пералёт, багаты эпізодамі, паказваючымі мужнасць і бясспрыкладную адвагу лётчыкаў. Не гледзячы на выключна нялётныя ўмовы, экіпаж правёў самалёт па намечанаму маршруту, бліскуча выканаўшы заданне партыі і ўрада. З такім-жа бліскучым майстэрствам патрэбна было правесці самалёт і на гэты раз, хоць траса была яшчэ больш няжкай.

У якіх нязмерна цяжкіх умовах праходзіў пералёт, выразна гаворыць тэлеграма, пасланая Байдуковым на імя таварыша Сталіна, тт. Варашылава, Рухімовіча, Кагановіча і штаба пералёту.

«Я разумею, як вы трывожыцеся. Але зразумейце і нас, што палёт адбываецца хапя і дакладна, але не так проста. Няжкіх гадзін палёту было не мала. Цяпер я вольны ад сляпога палёту, бо ў пачатку Канады пакуль ясна і ціха. Я зараз перадаю Вам найлепшыя пажаданні ў вашых справах ад экіпажа. Дзякую за ўсё і прашу не турбавацца. Няжкае перамаглі і рады, што ў асноўным ужо рашылі заданне свайго Урала і свайго народу. Прывітанне — Байдукоў».

Толькі вера ў свае сілы, у бездакорныя якасці айчыннага самалёта, пачуццё адказнасці перад народам, чый гонар яны неслі праз вяршыню свету, праз полюс непрыступнасці, натхнялі смела ісці і перамагаць усе труднасці, толькі-б з гонарам завяршыць у імя свайго народу бясспрыкладны пералёт.

І вось зараз, калі Георгій Байдукоў, разам са сваімі слаўнымі таварышамі пасля трыумфальнага шэства па Амерыцы і Еўропе, ступілі на родную совецкую зямлю, хочацца ўспомніць аб Егорушку з ціхага поўстанка Тарышта Вялікай Сібірскай магістралі. Васьмі год Егорку аддалі ў школу на ст. Чыны. Яго палохала соннае жыццё поўстанка, і аднойчы, ухапіўшыся за тормаз на хвіліну спыніўшагася поезда, ён збег з дому і стаў беспрытульнічаць. Праз тры гады Егор зноў вяртаецца ў сям'ю і навучаецца ў ваенна-палоннага чэха Влалека лахавай справе.

«Я ўступаў у такі ўзрост, калі пачынаюць задумвацца над жыццёвым шляхам, — расказвае Байдукоў пра сваё дзяцінства ў артыкуле «Мой лётны шлях». — На маё шчасце, советы знімалі падростаў з цяжкай працы і накіроўвалі вучыцца. Мяне таксама адкамандзіравалі ў чыгуначную профшколу. Мне было ў той час 15 год. Я вучыўся не дрэнна. Аднак у першы час азарны мой характар туга паддаваўся перавыхаванню.

Азарны характар Байдукова туга паддаваўся перавыхаванню і тады, калі ён стаў курсантам у Ленінградскай ваенна-тэарэтычнай школе лётчыкаў. Гэта «азарная струнка сібірскага палыўнічага дала сябе ведаць» і тады, калі Байдукоў лятаў ужо на баявых машынах. З-за азарства і фокусніцтва ён папярэпеў аварыю, ён разбіў машыну, якую так любоўна, па віноўніку збіралі совецкія людзі. Гэта вельмі ўзвяроіла на Георгія, і ён з гэтага часу глыбока стаў задумвацца над шкодным паводзінамі свайго азарнога характару.

Залішняя ліхасць і ўдаль, гульня ў рызыку, не шкадуючы сябе — гэта ўласцівасці, не характэрныя для совецкага лётчыка. І рашткі паветранага азарства Георгія Байдукова адсеяліся, як непатрэбныя, запазычаныя ад авантурнай героісі буржуазных лётчыкаў. Як і Чкалаву, як і ўсім лётчыкам, яму на ўсё жыццё запомніліся словы таварыша Сталіна, сказаныя на сустрэчы з ім летам 1935 года:

— Жыццё чалавека даражэй любой машыны.

У гэтых словах гучала бацькаўская ласка вялікага прадзыра, яго клопаты аб кожным чалавеку. Яны ўзнімалі адказнасць за даручаную справу, абавязвалі заўсёды помніць аб сабе ўсюды, пры якіх бы там ні было няжкіх абставінах. Гэта падкрэсліваў таварыш Сталін і пры зацвярджэнні праекта пералёту праз Паўночны полюс.

У мінулагоднім транспалярным пералёце Масква — востраў Уд Байдукоў паказаў сябе вылатным майстрам пілатавання. Большая частка палёту праз туманы і хмары ляжала на яго вопыце і ўменні. Той пералёт канчаткова здружыў адважную тройку — Чкалава, Байдукова і Белякова. Такія-ж высокія якасці паказаў Байдукоў і ў апошнім пералёце.

Толькі суровая школа знішчальнікаў, якою камандаваў Валерый Чкалаў, зрабіла з Байдукова таго спакойнага, вопытнага і бясстрашнага лётчыка, якім ведаюць яго зараз прапоўныя Совецкага Саюза, якім вядае яго ўвесь свет. Ён вышаў з гушчы народных, яго выхаваў гэты народ і ён стаў любімцам і героем свайго свабоднага народу.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

Штурман слаўнага карабля

Дзесятнаццацігадоваму юнаку Аляксандру жыццёвая перспектыва была зусім яснай. Яму, сыну вясковага настаўніка, дарогу ў свет павінен быў вызначыць універсітэт. Навучаючыся ў Ласным інстытуце, ён марыў:

— Кончу інстытут, атрымаю дыплом і потым буду працаваць ляснічым дзе-небудзь у сібірскіх ці уральскіх лясах...

Чароўныя мары аднак не збыліся. Іх адкінула назаўсёды імперыялістычная, а потым грамадзянская вайна. Салдатам сустрэў Аляксандр Кастрычніцкую соцыялістычную рэвалюцыю. Памятае ён Чырвоную Армію першых гадоў яе існавання, памятае легендарную дывізію Чапаева, у якой ён служыў; памятае, як працаваў у павятовым совеце. Фармаваўся і рос такім чынам сёнешні Герой Совецкага Саюза Аляксандр Белякоў у дні, калі мужнела, складвалася і выходзіла на шырокую дарогу ўся наша совецкая радзіма, увесь наш гераічны народ. А ён, Аляксандр, — толькі сын гэтага народу.

З 1920 года Аляксандр Белякоў назаўсёды звязаў свой лёс з совецкай гераічнай авіяцыяй. Ён быў пасланы ў авіяцыйную школу на аэранавігацыйнае адзяленне. Маладая, толькі-што нараджаўшаяся штурманская справа вабіла Аляксандра сваёй малавядомасцю, нязведанасцю. Як сын народу ён гатоў быў вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца. Самая малалая тады прафесія на зямлі — штурман стала другой марай, рэальнасць якой адчуваем усе мы зараз, калі гераічная тройка сыноў нашай радзімы «адкрыла новую Амерыку» праз Паўночны, непрыступны ў мінулым полюс.

Каля трыццаці год выхоўвае ў сябе любоў да вучобы Аляксандр Белякоў. І ў сельскай школе, і ў гімназіі, і на фронце, і ў наш час, — усюды вучыўся гэты прывабны, шырокаплечы чалавек, авалодваў вёдамі, якія служаць чалавецтву, праграсу. Белякоў бачыў, як змагаліся нашы лётчыкі на франтах грамадзянскай вайны. А змагаліся мужна, рашуча. Дзейнасць іх, аднак, не заўсёды мела вялікую эфектыўнасць... толькі таму, што мала ведалі... матэматыку.

І Белякоў гэта ўлічыў, ён добра ўсвядоміў тое, што трэба з ворагамі змагацца мужна, але адвагу і мужнасць неабходна дапоўніць халодным, але дакладным матэматычным палікам.

Багатая вучоба, работа над сабою, веданне жыцця, уменне багатыя тэхнічныя навыкі прыстасоўваць у практыцы — усё гэта дае нашым штурманам дасягнуць мэту ў найкарацейшы тэрмін, з найменшай затратай энергіі і гаручых матэрыялаў дасягаць вяршын такой славы, аб якой толькі марыць маглі лепшыя людзі авіяцыйнай навукі і практыкі. Слава Белякова — гэта слава совецкіх штурманаў, якія могуць весці паветраныя караблі ў любы час, у любое надвор'е, у любым напрамку.

***

Траса Масква—Паўночны полюс—Паўночная Амерыка палёту гераічнай тройкі герояў Совецкага Саюза была непрыступнаю, недасяжнаю. Аб такім палёце авіяцыйны свет марыў толькі праз дзесяткі год. Гэты складаны і няжкі шлях, як чарговую крэпасць, узялі большэвікі. Нашы лётчыкі ляцелі па гэтым шляху да вызначанай мэты як сапраўдныя большэвікі. Яны, як піша адна буржуазная газета Амерыкі, — як сапраўдныя комуністы, не адхіліліся ні ўправа, ні ўлева. Так, мэта дасягнута. Свет здзіўлен не толькі мужнасцю сыноў нашай радзімы, але і тэхнікай, якая выдатна служыла выдатнаму пералёту.

Надзвычай адказнай была работа штурмана Аляксандра Белякова ў гэтым пералёце. Гэта яго задача — вызначаць напрамак палёту, месца знаходжання самалёта: Дзе карабль не быў-бы, ён, Белякоў, павінен быў дакладна вызначыць і вышыню, і напрамак палёту, і дакладнасць і рашчэ, і вырашаць і «наляту», як кажуць, мяняць напрамак. Яго майстэрства, як і майстэрства Чкалава, Байдукова, было непераможным ля Скалістых гор Канады, у закрытай цыклонам Новай Зямлі, над узбярэжжам Ціхага акіяна, у сляпым палёце над востравам Рудольфа, пры сустрэчных вятрах-зверах, штормах-буянах і праліўных дажджах.

«На наш лёс выпаў гонар, — гаварыў і пісаў у газетах Аляксандр Белякоў, — пракласці авіяцыйную трасу з Масквы ў Паўночную Амерыку праз Паўночны полюс. Гэта траса амаль не даследавана. Наперадзе нас чакаюць туманы, дажджы, воблачнасць, магчымасць абледзянення»...

Многае з гэтых непрыемных перашкод экіпаж карабля сустрэў яшчэ на тэрыторыі совецкага ўзбярэжжа Арктыкі. Па прапанове Белякова пілот «наляту» змяніў напрамак палёту, калі Новая Зямля была закрыта цыклонам. А наогул надвор'е пачало псавацца яшчэ над Кольскім поўвостравам...

Затым былі воблакі, буры і праліўны дождж. На вышыні 2.500 метраў экіпаж майстэрска вынайшоў «карыдор», праз які дабраўся да Барэнцава мора. Далей — зноў пыклон, зноў сляпы палёт. Вышыня да 6 тысяч метраў, абледзяненне самалёта паўтараміліметравым ільдом. Ва ўсе гэтыя моманты Белякоў толькі бачыў свае прыборы і прымушаў іх працаваць бездакорна, беззаганна.

Упэўнена ён сядзеў у сваёй штурманскай кабіне. Наперадзе мэта, у сэрцы любоў да радзімы, да свайго народу, да настаўніка і друга совецкіх лётчыкаў таварыша Сталіна. Белякоў працаваў хладнакроўна, з верай у перамогу, з надзеяй ў машыну, у прыборы совецкай вытэрпчасці. У яго кабіне магнітны компас, сонечны ўказальнік курса і радыёкомпас. Далей гадзіннік і ўказальнік хуткасці і вышыні. Непадалёку антычны візір, на асобай раме прыёмна-перадатачная станцыя. Гэта адсюль увесь свет атрымоўваў два лакамічныя, радуючыя ўсіх нас, словы: «усё ў парадку».

Праляцеўшы Паўночны полюс, герояў сустракалі ўсё новыя і новыя перашкоды. «Полюс непрыступнасці» Белякоў узяў са сваімі таварышамі, полюс заваявалі нашы людзі, нашы машыны. Да 6 тысяч метраў узнімаўся самалёт над амерыканскай Арктыкай і зноў апускаўся. Недахоп кісларода прымушаў нашых герояў змагацца з апошняй цяжкаспю, з апошнім бар'ерам. Але ён пройдзен, так слаўна і гераічна, як пройдзен увесь вялікі Сталінскі маршрут. На ўсім шляху баявы штурман, выдатны чалавек Аляксандр Белякоў аставаўся верным сынам сваёй радзімы, выконваў сваю сур'ёзную, цяжкую работу з гонарам, дастойным большэвіка.

***

«Усё ў парадку» — гэтыя лакамічныя словы прагна лавілі радыёстанцыі ўсяго свету. Радысты нястомна працчупвалі эфір, каб з невядомых вышынь улавіць пазыўныя чырвонакрылага паветранага карабля. «Усё ў парадку» было выразам упэўненасці экіпажа ў сабе і машыне, выказвала волю да перамогі, наперакор любым перашкодам Арктыкі. І кожны грамадзянін Совецкага Саюза, чакаючы чарговага паведамлення аб пералёце, ведаў, што пачуе па радыё або ўбачыць у свежым нумары газеты перададаную Белаковым наступную радыёграму з самалёта з нязменнай канцоўкай: «Усё ў парадку».

Інакш і быць не магло. Белякоў удзельнічаў у першым пералёце па Сталінскаму маршруту летам 1936 года. Успамінаючы той пералёт, Белякоў падкрэсліваў: «Іменна дакладнасць і прадуманасць падрыхтоўкі дапамаглі ў многім паспяховаму завяршэнню нашага пералёту. Таварыш Сталін нам аднойчы сказаў: «Я за тых лётчыкаў, якія ўмеюць спалучаць мужнасць і храбрасць з уменнем». Я імкнуўся поўнасцю апраўдаць гэтыя словы». З тым-жа поспехам, як апраўдаў гэтыя словы ў першым пералёце, Белякоў апраўдаў іх і зараз.

Пасля пасадкі самалёта ў Амерыцы Аляксандр Белякоў яшчэ доўга аставаўся ў паветры, гарэў на працы, з любоўю прыбіраючы свой карабель. Тав. Байдукоў у сваіх артыкулах «Наш палёт у Амерыку» апавядае пра гэта:

— Саша яшчэ ў паветры спакойна пачаў уборку самалёта, і ніякія крыкі Чкалава не маглі адцягнуць яго ад гэтай работы. І зараз яшчэ ён, не спяшаючыся, робіць ўборку, выкідвае вяроўкі, паперу, складвае карты і журналы. Я пакінуў яго за гэтымі заняткамі і выскачыў на зямлю...

Толькі на зямлі адчуў і Аляксандр Белякоў сябе свабодным, бо вялікае, сталінскае заданне было выканана. На стомленым твары яго гарэла шчаслівая і радасная ўсмешка. Адчуванне зямлі, людзей, якіх так доўга не бачылі, прыліў новых сіл і—першая думка пра Сталіна прымусіла сэрца біцца часцей, з'явіцца невыказнаму хваляванню.

Аляксандр Белякоў адчуваў сябе мужна і ўзбуджана ў такой меры, як і Чкалаў, Байдукоў. Ён—частка легендарнай тройкі герояў, у якіх адны пачуцці, адна любоў, адно жаданне і адна эера і ўпэўненасць у справу, якую яны так гераічна рабілі і будуць яшчэ лепей рабіць.

Пав. КАВАЛЁЎ.

Камандзір экіпажа «АНТ-25» Герой Совецкага Саюза тав. В. П. ЧКАЛАЎ з жонкай Ольгай Эразмаўнай і сынам Ігарам (здымак зроблен у 1936 годзе).

Фото Дарэнскага (СФ).

ГОРДАСЦЬ СТАЛІНСКІХ СОКАЛАЎ

У тыя незабываемыя дні першага пералёту па нязведанаму маршруту праз Паўночны полюс на старонках газет прамільгнуў адзін з шматлікіх фотаздымкаў, якія паказвалі Валерыя Чкалава перад самым палётам.

Моцная, шырокаплечая постаць вырысоўваецца на фоне чэрвеньскага світання. Праз некалькі хвілін легендарны чырвонакрылы самалёт адарвецца ад роўнага поля аэрадрома. Наперадзе—цяжкая, нявывучаная траса, жорсткія цыклоны над Ледавітым акіянам, грузныя наплывы хмар, дажджы і сцюжа. Ці мала нечаканасцей рыхтуе капрызная палярная стыхія! Але Чкалаў спакойны. Упэўнены, сканцэнтраваны, ён дакурвае папяросу. Задумёны твар не выказвае ні цені хвалявання.

У спакоі і ўпэўненасці, ва ўсёй сабранай моцнай постаці адчуваецца чалавек магутнай сілы волі, сталёвай загартоўкі, нявіданай адвагі. І разам з тым, яму ўласцівы і ўсе звычайныя чалавечыя рысы і пачуцці. Умеючы ўпэўнена весці паветраны карабель па незнаёмых, нязмерных дарогах, ён умее смяяцца ад душы, жартаваць, жыць поўнакроўным жыццём чалавека здаровага фізічна, адаронага, поўнага энергіі і бадзёрасці.

Мужны валявы воблік Чкалава па партрэтах і фотаздымках уяўляе сабе кожны з грамадзян нашай неасяжнай радзімы— ад пасівелага старыка да сямігадовага хлопчыка. Яго імя ведае ўвесь свет, які быў усхваляван гэтым патрасаючым па грандыёзнасці і адвазе пералётам.

Як і ўсе са слаўнай шарэнгі Герояў Совецкага Саюза, Чкалаў—гэта народжаны Кастрычнікам, выхаваны большэвіцкай партыяй сын вялікага народу. Гаворачы пра сябе, ён ніколі не забывае, каму ён абавязан сваім ростам, сваімі подвігамі. Год таму назад, праляцеўшы па першаму Сталінскаму маршруту—Масква—востраў Уд, Чкалаў на мітынгу рабочых авіяцыйнага завода, на якім ён прапаваў лётчыкам-выпрабавальнікам, заявіў:

— Дзякую вам, таварышы. Вы дапамаглі мне стаць Героем. Вы зрабілі мяне такім, які я ёсць.

У Лондане, куды па дарозе з Паўночнай Амерыкі заехалі Чкалаў, Байдукоў і Белякоў, як і ўсюды, цэлая армія журналістаў закідала Герояў бясконцымі пытаннямі.

— Дзе Вы вучыліся?—запыталі між іншым журналісты Чкалава і атрымалі характэрны па выразнасці і прастаце адказ:

— Ды там-жа, дзе вучыліся ўсе нашы рэбяты ў даўно прайшоўшыя дні. Сапраўднай школай была грамадзянская вайна, рэволюцыя, партыя большэвікоў. Гэта была школа другой ступені. Добрая школа, магу вас запэўніць.

У авіяцыю Чкалаў прышоў юнаком. Да гэтага ён паспеў ужо прайсці нялёгкі жыццёвы шлях рабочага-падростка, пазнаўшы на сваёй спіне прыгнёт і эксплуатацыю. Поўны сіл, упарты юнак настойліва прабіваўся праз жыццёвыя нягоды. У гады грамадзянскай вайны Чкалаў—15-гадовы чырвонаармеец—добраахвотнік. Рэволюцыя ўзняла яго, як і сотні тысяч іншых маладых працоўных, на актыўную барацьбу за новае жыццё.

Больш за ўсё яго вабіла лётная школа. Праз некалькі гадоў мара была ажыццёўлена. Чкалаў заканчвае школу лётчыкаў і, пазней, школу вышэйшага пілатажа.

Новыя перспектывы адкрываюцца перад маладым Чкалавым. У авіяцыі ён знайшоў сваё прызванне, бязмежнае поле для прыкладання сваіх кіпучых сіл і здольнасцей.

Адзін з настаўнікаў Чкалава, выдатнейшы лётчык нашага часу М. М. Громаў, які вырасціў нямалую пляяду сталінскіх сокалаў, па праву ганарыцца сваім таленавітым вучнем. Скончыўшы лётнае навучанне, Чкалаў становіцца лётчыкам-выпрабавальнікам.

Высокакваліфікаваны пілот, які авалодаў тэхнікай пілатавання да віртуознасці, ён часта не шкадаваў, не шкадуе сябе. У асяроддзі лётчыкаў яго ведалі, як выключнага храбраца, паветранага азарніка, аматара самых рызыкоўных палётаў. У сваёй адвазе і рызыцы Чкалаў часам нават парушаў лётніцкую дысцыпліну і выклікаў справядлівыя заўвагі і папярэджанні.

Шырока вядома безліч эпізодаў і выпадкаў з яго лётніцкай практыкі. Аднойчы, выпрабоўючы самалёт, ён зрабіў у запар 220 мёртвых пецель. У другім выпадку, пралятаючы на нізкай вышыні і ўбачыўшы наперадзе два высокіх дрэвы, паміж якіх праляцець было немагчыма, ён перавярнуў самалёт рабром і правёў паміж дрэвамі, не закрануўшы іх. Палёт без кавалку крыла, адломленага пры старце, бясконцыя віткі, галавакружальныя віражы, брыючыя палёты, узыходзячы штопар, ні адзін з відаў вышэйшага пілатажа не з'яўляўся для Чкалава немагчымым. З самага небяспечнага становішча ён выходзіў з поспехам.

Гэта не быў авантурны гераізм, неабгрунтаваная рызыка. Ведаючы да дробязей машыну, даверяючы свайму майстэрству, Чкалаў не абмяжоўваўся ідэнтнутым. У кожным палёце ён шукаў новае, што было-б карысным для авіяцыі, для краіны.

Летам 1935 года совецкі ўрад дазволіў Чкалаву здзейсніць грандыёзны транспалярны беспасадачны пералёт з Масквы па Паўночнаму ўзбярэжжу Совецкага Саюза і далей — на поўдзень над Дальнім Усходам. 56 гадзін самалёт «АНТ-25», які стаў пяпер легендарным, ляцеў над нязведанымі прасторамі, перамагаў арктычныя цыклоны і туман. Пералёт быў самай смелай разведкай Арктыкі, удачнай рэпетыцыяй наступных яшчэ больш смелых і зелізарных пералётаў.

Выключна высокую ацэнку даў увесь совецкі народ, саюзны ўрад і асабіста таварыш Сталін гэтаму першаму пералёту па Сталінскаму маршруту. Чкалаву, Байдукову і Белякову былы прысвоены званні Героя Совецкага Саюза.

Здавалася, гэта магло-б з'явіцца мяжой шуканняў і імкненняў Валерыя Чкалава. Але не такога складу герой-большэвік, каб спыняцца нават на небывалых поспехах. Толькі што вярнуўшыся з пералёту, на аэрадроме, дзе гераічнаму экіпажу была наладжана дастойная сустрэча, Чкалаў зварачаецца да таварыша Сталіна з новай просьбай:

— Дазвольце, Іосіф Вісарыёнавіч, яшчэ раз паляцець, і магчыма куды небудзь далей...

Ён даўно зынашваў мару пра палёт на Паўночны полюс. Яго вабіла асваенне недакрытых паветраных шляхоў, якія служылі-б пратрэсу, справе ўсяго культурнага чалавецтва. Адным з такіх шляхоў быў найкарацейшы шлях паміж Совецкім Саюзам і Паўночнай Амерыкай праз Паўночны полюс. Мара стала рэальнай, блізкай ла ажыццяўлення, калі Паўночны полюс быў заваяван большэвікамі, і чарвёрка адважных палярных даследчыкаў па-гаспадарску размясцілася на самым полюсе—на ільдзіне.

25 мая на пасяджэнні ўрада, пасля дэталёвага абмеркавання прадстаўленага Чкалавым праекта, пералёт быў дазволен. Таварыш Сталін асабіста цікавіўся кожнай дробяззю пералёту і даваў указанні, якія гаварылі аб вялікіх бацькаўскіх клопатах правадыра аб людзях.

«Я не ведаў,—успамінае ў адным з артыкулаў Чкалаў,—якімі словамі падзякаваць таварыша Сталіна за найвялікшае давер'е, аказанае нам. Моцна паціскаючы руку дарагому правадыру, я сказаў:

—Дзякую, таварыш Сталін, за давер'е. Мы апраўдаем яго.

З пачуццямі невыказнага захаплення перад адвагай Герояў сачыў увесь свет за пералётам. Не было межаў захапленню і таму, калі «АНТ-25» шчасліва апусціўся на аэрадроме Ванкувера далёка па той бок Паўночнага полюса на амерыканскай зямлі.

Цяпер, сустракаючы Чкалава і яго застойных сяброў тут, па зямлі соцыялістычнай радзімы, мы бачым, як бліскуча імі апраўдана давер'е правадыра і ўсяго совецкага народу. У гісторыі чалавецтва гэты пералёт, не меўшы сабе падобных, будзе запісан як новая бясспрыкладная перамога краіны соцыялізма.

Валерый Чкалаў — гордасць сталінскіх сокалаў. У ім увасоблена усё лепшае, што характарызуе наш вялікі народ, які пабудаваў соцыялізм. Совецкая моладзь на прыкладзе росту і подвігаў Чкалава вучыцца на любым даручаным участку праяўляць такія-ж здольнасці. І калі мы чуем аб дзеятвары, што часта ў гульнях інсцэніруе пералёт праз Паўночны полюс, выраз: «Хачу быць Чкалавым»—гэта алначае імкненне з дзіцячых гадоў успрыняць мужнасць, адзагу, сілу волі, імкненне быць дастойным прадстаўніком эпохі Сталіна, якім з'яўляецца Валерый Чкалаў.

Тар. ХАДЖЕВІЧ.

ДЗІЎНАЯ БЕСТУРБОТНАСЦЬ

На Прэсбюро ўскладзены вельмі адказныя функцыі — забяспечваць цэнтральныя і мясцовыя газеты артыкуламі на самыя рознастайныя тэмы. Такім чынам гэта арганізацыя алкрывае сваім аўтарам найшырэйшую магчымасць друкавацца ў многіх газетах. Здавалася-б, падбор аўтароў, праверка не толькі іх літаратурных якасцей, але і, галоўным чынам, палітычнай устойлівасці, надзейнасці павінны быць у цэнтры ўвагі Прэсбюро. На жаль, гэтага няма. Аб гэтым сведчыць наступны агідны факт. 5 ліпеня Прэсбюро разаслала цэнтральным і абласным газетам артыкул «Развал гаспадаркі фашысцкай Германіі». Аўтар артыкула С. Яворскі праз некалькі дзён пасля рассылкі артыкула быў зыкрыт, як вораг народу. Аднак кіраўнікі Прэсбюро (у прыватнасці, рэдактар т. Мішурыс), якія нясуць адказнасць за падбор аўтароў, зрабілі грубейшую памылку: яны не ўдасужыліся нават паведаміць газетам, што артыкул ворага народу С. Яворскага друкаваць непатрэбна.

22 ліпеня гэты артыкул быў надрукаван у цэнтральнай газеце «Социалистическая связь». Рэдактар «Социалистической связи» тав. Валодзін, у сваю чаргу, не палічыў патрэбным праверыць, што сабою прадстаўляе аўтар артыкула, які ў партфелі рэдакцыі паспеў праляжаць ужо звыш двух тыдняў.

Такім чынам, па міласці бяспечных кіраўнікоў Прэсбюро і бяспечнага рэдактара «Социалистической связи» артыкул ворага народу ўбачыў свет.

«Правда».

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя газеты «Звязда», своечасова не атрымаўшы паведамлення Прэсбюро аб аўтару, таксама надрукавала артыкул «Развал гаспадаркі фашысцкай Германіі», дапусціўшы такім чынам буйную памылку.

СКОНЧЫУСЯ СХОД АКТЫВА НАРКОМЛЕСА

Не выпадкова цэнтрам узагі ў спрэчках увесь час з'яўляецца трэст «Лесбел». Тут дагэтуль сядзяць яшчэ нявыкрытыя шкоднікі і ворагі народу.

На ухвальскім механізаваным пункце (Круцкі леспрамгас) выходзяць са строю трактары, наглядаюцца частыя паломкі і азарыі. Спецыяльная драўніна, прызначаная для абароннай і фанерный прамысловасці, свядома вывозіцца ў апошнюю чаргу. Для таго, каб яе нельга было вывезці з лесу, кіраўнікі пункта закідваюць гэту драўніну хвойнымі пародамі. Рэсін накіроўвае сюды «моцнага і вытрыманага» работніка Яшчанку. Гэты самы Яшчанка нядаўна выгнан за розныя злачынныя справы з бабруйскай мэблевай фабрыкі імя Халтурына. Яшчанка і зараз шкоднічае. Да яго з'язджаюцца былыя работнікі «Лесбела», выкрытыя за шкодніцкія справы,—Быкоўскі, Бандараў. Яшчанка прадастаўляе ім машыну для правядзення антысавецкай агітацыі.

Гэта самая шайка ў свой час па-шкодніцку праектавала новыя механізаваныя пункты. У глыбінных пунктах, дзе недастаткова гужавой сілы (Мазыршчына), пункты не арганізоўваліся.

Жыткавіцкі механізаваны пункт пабудавалі за 80 кілометраў ад населенага пункта. Шкоднікі прапанавалі ўкласці ў гэты пункт 600 тыс. руб. Гэта рабілася з мэтай амярэвіць велізарныя сродкі. Пабудова складаў праектавалася ў лясной глушы, на багністым балоце. Калі гэты манеўр не ўдаўся, то работнік «Лесбела» Стрэшынскі ўносіць праект зусім ліквідаваць механізаваны пункт. Да-рэчы, кіраўнік праектавальнага бюро Ізотаў зараз працуе ў аддзеле механізацыі «Лесбела».

Хіба выпадкова такая з'ява, калі на капітальны рамонт трактараў і аўтамашын сёлета не адпушчана ні адной капейкі? Аддзел механізацыі няпразільна плануе аллеглась па механізаванай вывазцы і гэтым садзейнічае вялікім перавылаткам гаручага і стварае ўмовы для злоўжыванняў.

Тт. Гурвіч, Іўры, Лучнік, Качароўскі, Егудкін прывялі многа фактаў засмечанасці апарата «Лесбела» і леспрамгасаў.

Кіраўніком транспартнага аддзела ў трэсце з'яўляецца выключаны з партыі за пёмныя справы Пашук. Да апошняга часу гэты «кіраўнік» ніякіх мер не прыняў для выяўлення шкоднікаў і злачынцаў, якія выводзяць са строю коней і раскрадаюць дзяржаўную маемасць.

Аддзел тэхнічнага забеспячэння ўзначальвае выключаны з партыі Малорскі—чалавек, які судзіўся за розныя злачынныя махінацыі.

Таз. Рэсін не мала раз'язджае па леспрамгасах і механізаваных пунктах, але чамусьці ўсе агіднасці і шкодніцкую дзейнасць не «заўважае».

Рэсін сістэматычна засылае ў леспрамгасы неправераных людзей, асуджаных злачынцаў. Начальнікам Дулебскага лэпо Рэсін пасылае асуджанага за шкодніцтва Баранчыка. Калі-ж Баранчыка знялі з гэтага ўчастка, кіраўнік аддзела механізацыі Франкель яго рэкамендуе на Нёманскую ветку. Аддзелам кадраў быў знят з работы намеснік дырэктара Петрыкаўскага леспрамгаса Шрубак, як палітычна неправераны чалавек. Рэсін назначае яго выкладчыкам у Касцяневіцкую лясную школу.

Выгнаны з многіх леспрамгасаў і выключаны з партыі Лепельскім райкомам партыі за антысавецкія дзеянні інжынер Каралёў паслан у Крычаўскі леспрамгас таксатарам. Выключаны з партыі за правал работы Савіцкі, звязаны з братам-бандытам, прызначан намеснікам дырэктара Глускага леспрамгаса.

У мінулым годзе быў выкрыт у Гомельскім лесаінстытуце трацкісцкі выродак Фельдман, выключаны з комсамола і з інстытута. Фельдмана прытуліў на работу вораг народу трацкіст Калмановіч. Яго прызначаюць начальнікам Васілевіцкага лесаўчастка Рэчыцкага леспрамгаса. Тут Фельдман займаецца шкодніцтвам, правальвае лесазагатоўкі. Яго знімаюць з работы. Але Рэсін ніяк не можа расстацца з ім і дае яму новую пасаду—начальніка службы па лесазагатоўках на Іванаўскім механізаваным пункце. Калі начальнік пункта Лучнік адмовіўся ўзяць яго, Рэсін піша запіску: «катэгарычна супярэчу супроць звальнення Фельдмана з сістэмы Лесбела».

Былы намеснік дырэктара Рэчыцкага леспрамгаса Бацвінкін, які займаўся шкодніцтвам і зрываў лесазагатоўкі, зараз прызначан інструктарам «Лесбела». У апараце трэста да гэтага часу працуе Апановіч, які развяліў Бабіцкі механізаваны пункт, пакрываў шкоднікаў. Аб гэтым «Звязда» пісала яшчэ 5 ліпеня, але Рэсін груба ігнаруе сігналы аб засмечанасці апарата.

Усе гэтыя факты наводзяць на думку, што Рэсін праводзіў прамую лінію на насаджэнне ў леспрамгасах і апараце «Лесбела» класава-варожых людзей. Зараз робіцца ясным, чаму «Лесбел» сабатуе важнейшыя рашэнні партыі і ўрада.

Выступіўшыя на сходзе кіруючыя работнікі «Лесбела» Франкель, Кофман, Гінзбург і Міневіч не расказалі сходу аб сапраўдным становішчы ў трэсце.

На вячэрнім пасяджэнні 23 ліпеня выступіў з прамовай намеснік старшыні Соўнаркома БССР тав. Жураўлёў.

Пасля чатырохгадзіннай работы, 24 ліпеня, сход закончыў сваю работу. На актыве з усёй наглядзнасцю выявілася, што ў сістэме Наркомлеса дагэтуль беспакарна арудуюць зорагі народу пры прамым садзейнічанні такіх кіраўнікоў, як Рэсін.

Наркомлес амаль нічога не зрабіў для ліквідацыі вынікаў шкодніцтва і з алімпійскім спакоем наглядае за дзеяннямі ворагаў.

І. Т.

ХОД СЕЛЬГАСРАБОТ ПА РАЁНАХ БССР

на 20 ліпеня 1937 г. (у процантах)

№№ п/п.	Назва раёнаў	Убрана азім. і ранніх ярых	Звезена і абал. калг. ужытковых і ўборку камб. (у проц. да ажатага)	Выцярэблена калгасамі ільну	Скошана калгасамі сенажаці	Звезена і абал. калг. сена (у проц. да скош.)	Засіласавана калгасамі	Паднята калгасамі: Пароў	Паднята калгасамі: Цялінны пад пашню
1.	Нараўлянскі	67,8	80,5	15·4	91·3	95,9	16,8	31,3	41,9
2.	Мозырскі	64,7	56,9	21,3	80,9	90,0	18,0	40,0	34,2
3.	Капаткевіцкі	64,4	51,5	2,6	90,0	88,0	31,9	47,1	20,0
4.	Лельчыцкі	64,1	54,4	39,0	96,8	97,0	30,9	27,2	21,9
5.	Камарынскі	63,4	50·0	29,0	87,0	92·4	58,6	125,8	26,8
6.	Даманавіцкі	62,3	49,6	8,9	79,5	93,9	25,6	15,7	15,7
7.	Петрыкаўскі	61,4	43,6	—	82,7	91,2	19,1	14,0	8,6
8.	Ельскі	60,2	54,4	8,1	83·1	95,8	29,8	21,2	14,8
9.	Жыткавіцкі	59,0	16,7	—	91,6	95,0	41,6	21,8	9,0
10.	Хойніцкі	55,6	70·6	42,8	80,6	87,5	15,0	39,2	7,6
11.	Тураўскі	54,9	60,8	24,4	91,9	92·8	55,5	5,2	14,0
12.	Глускі	54,7	27,8	5,6	81,3	94,5	25,8	15,5	4,9
13.	Брагінскі	53,7	46,4	27,2	91,8	88,8	18,3	93,9	27,7
14.	Парыцкі	51,4	29,4	5·1	77·5	91,9	8,7	21,4	17,4
15.	Лоеўскі	47,2	36,1	3,7	95,8	92,3	47,9	58,7	32,0
16.	Рэчыцкі	45,4	27,7	2,3	80,6	74,9	22,9	49,0	9,0
17.	Бабруйскі	43,9	16,0	10,8	85,5	94·2	15,0	48,7	32,9
18.	Ушацкі	42,6	—	15·9	83,5	89,3	18,7	75,1	10,8
19.	Старадарожскі	41,6	9,0	5,8	93,9	94,6	7,3	27,9	21,3
20.	Любаньскі	41,3	18,9	52,4	98,1	92,1	10,6	9,7	80,2
21.	Узденскі	40,9	2,6	4,7	105,0	95,3	2,3	65,6	9,0
22.	Добрушскі	40,4	39,1	8·2	96,8	93·6	22,7	57,6	9,6
23.	Грэскі	40,2	8,3	64,9	111,1	95,7	1,8	92,1	2,8
24.	Старобінскі	37,7	13,6	75,3	90,4	91,9	6,5	35,6	0,6
25.	Жлобінскі	35,1	48,6	20,3	77·8	92,2	11,6	44,8	10,9
26.	Клічаўскі	34,9	47·1	5,1	85,9	92,8	4,0	107,5	13,5
27.	Гомельскі	34,5	18,6	27,5	74,7	90,7	9,2	89,9	16,3
28.	Веткаўскі	34,2	7,1	20,2	91,6	93·3	42,1	61,0	6,8
29.	Асіповіцкі	33,6	14,5	8·3	91,1	94,0	4,7	59,8	10,0
30.	Бягомльскі	33,0	7,9	1,5	104,6	99,8	16,4	83,7	11,6
31.	Уваравіцкі	32,9	9,0	10,8	97·2	86,3	17,5	69,4	2,0
32.	Чырвонаслабодскі	32,8	21,9	94,6	103,8	89,3	13,9	33,7	—
33.	Рагачоўскі	31,4	23·3	19,5	88,8	90,3	10,4	65,4	17,0
34.	Журавіцкі	31,0	43,3	19,0	86·8	95,5	26·3	98,3	20,0
35.	Кіраўскі	30,4	13,7	25,4	101,6	75,5	9,7	100,0	8,7
36.	Чавускі	30,1	17,4	39,1	88,7	96,2	9,3	69,7	21·3
37.	Прапойскі	30,1	48,2	15·5	83,0	91,9	28,5	63,1	32,5
38.	Копыльскі	30,0	14,4	50,0	102,1	93,8	2·7	83,7	81,7
39.	Быхаўскі	28,7	37,8	15,5	89,9	85,5	6,4	65,2	5,0
40.	Будакашалёўскі	28,4	27,3	21,4	76,6	83,6	11,8	76,0	30,8
41.	Магілеўскі	28,3	54·2	59,6	104,9	100,0	1·5	89,2	20,8
42.	Пухавіцкі	28,3	4,6	25,9	85,1	90,4	8,2	64,1	17,5
43.	Церахоўскі	28,1	8,2	20,9	91,0	90,7	17,0	62,2	5·8
44.	Чэрыкаўскі	27,0	12,4	64,5	88,6	73,9	17,6	55,8	0,4
45.	Свяцілавіцкі	26,4	11,4	23·4	62,0	86,6	25·7	49,4	12,0
46.	Смілавіцкі	26,1	0,6	53,5	84,0	86,2	4,1	84,7	25,7
47.	Чачэрскі	25,9	39,2	27,1	80,1	90,7	8,7	64,2	11·7
48.	Чэрвеньскі	25,5	3,1	21,4	81,1	92,1	2,6	71,0	10,3
49.	Аршанскі	25,3	48·5	59,9	100,0	95,3	3·0	89,7	26,0
50.	Касцюковіцкі	24,8	19,5	17,8	67,9	85,3	37,5	81,3	16,1
51.	Дрыбінскі	24,6	37,3	15,0	94,6	96,1	8,8	81,3	21·1
52.	Плешчаніцкі	24,3	0,5	—	100,9	94,1	2,8	79,8	23,7
53.	Барысаўскі	24,1	14,5	13,7	83,1	91,0	2·9	115,2	16,8
54.	Бярэзінскі	23·9	24,7	17,9	94,9	95,8	7,1	90,1	22,5
55.	Слуцкі	23,6	5,5	29,7	97,0	92,2	4,2	88,7	28·4
56.	Мсціслаўскі	23,0	25,4	14,5	87,5	85,0	35,7	129,0	13,4
57.	Смалявіцкі	22,3	6,2	5,2	94,3	92,6	1·0	113,3	12,7
58.	Бялыніцкі	22,2	—	41,0	91,6	65,9	8,6	82,6	25,7
59.	Ветрынскі	21·5	5,1	1,7	84,4	81,8	27,9	75,3	1·3
60.	Крычаўскі	20,5	30,3	11,9	92,1	83,1	32,8	73,9	8,9
61.	Клімавіцкі	19,0	15,5	12,6	75,5	84,2	8·6	77,6	3,3
62.	Менскі	17,9	—	8,1	99,9	95,4	6,7	146,9	28,0
63.	Сенненскі	17,8	—	17,3	92,6	82,1	14,3	62,6	7·1
64.	Кармянскі	17,3	73·6	11,7	67,9	85,3	4,2	75,5	7,8
65.	Ч.-Польскі	17,3	27,6	4,1	62,8	91,0	3·6	46,6	9,0
66.	Віцебскі	16,2	—	1,9	78,9	88,2	16,3	72,1	24,8
67.	Мехаўскі	16,2	16,5	0,3	50,2	91,4	29,6	93,8	10·3
68.	Шклоўскі	15,8	27,3	59·5	93,4	80,1	2,3	107,2	30,1
69.	Крупскі	15,8	7,6	20,4	88,9	90,4	3·0	97,1	15,4
70.	Хоцімскі	15,4	11,7	15,7	73,1	83,2	6,8	85,3	27,0
71.	Расонскі	15,3	19,0	—	66,8	85,1	52,6	57,7	5·7
72.	Халопеніцкі	14,7	6·8	16,1	79,3	89,5	16,9	89,0	23,5
73.	Лагойскі	14,7	8,5	9,8	97,9	94,1	2·3	80,2	36,4
74.	Горацкі	14,2	14,9	13,6	97,3	91,0	43,8	85,8	38,1
75.	Лепельскі	14,0	6,1	10,8	82,8	89,7	27,3	104,1	21·9
76.	Заслаўскі	13,8	—	4·0	109,9	98,6	7,1	69,9	7,5
77.	Багушэўскі	13,7	14,9	6,2	74,3	81,2	13·0	75,0	18,4
78.	Сіроцінскі	13,0	4,3	0,2	71,1	87,9	14,3	67,8	60,9
79.	Асвейскі	12,4	—	4,7	86,9	81,6	52,2	83,3	21·8
80.	Чашніцкі	12,3	1,0	47·2	85,3	90,7	38,5	93,8	18,9
81.	Гарадоцкі	10,3	6,7	0,5	70,3	91,6	20·3	81,1	5,4
82.	Круглянскі	10,2	1,5	20,6	96,0	91,1	—	102,9	27,6
83.	Бешанковіцкі	10,1	3,8	12,2	75,0	86,1	13,2	78,6	15,1
84.	Дубровенскі	9·8	7,5	4,8	76·8	54,9	18,4	99,7	66,5
85.	Дзержынскі	8,8	8,8	2,0	96,1	90,9	0,5	85,1	2,7
86.	Талачынскі	8,7	3,5	39,8	89,8	92,7	8,3	77,9	14,9
87.	Суражскі	8,4	—	0,3	61,3	83·0	19,9	76,7	45,1
88.	Полацкі	8·2	—	1,0	74,0	85,3	23,6	66,9	1,5
89.	Лёзнянскі	8,0	30,9	2,1	72,6	85,3	21,8	77,0	19,8
90.	Дрысенскі	6,3	—	1,2	87·5	80,4	68,0	107,6	10,8
	Па БССР	27,4	26,3	18,0	84,4	89,3	16,6	73,2	18,3
	Было на 15/VII—37 г.	9,5	17,8	6,6	78,5	86,3	15,4	70,9	18,2

УЧОТНА-СТАТЫСТЫЧНЫ АДДЗЕЛ НАРКАМЗЕМА БССР

12 ГЕКТАРАЎ ЗА РАБОЧЫ ДЗЕНЬ

ГОРКІ, 25 ліпеня. **(Спец. кар. «Звязды»).** Ільнацерабільшчык Горацкай МТС тав. **Мачульскі** і трактарыст тав. **Карпіцкі**, працуючы на шыроказахватнай ільнацерабілцы «ВНІЛ-5» у калгасе «Большэвік», Панкратаўскага сельсовета, за два поўных рабочых дні выцерабілі 24 гектары пры норме 4 гектары ў рабочы дзень. За гэтыя дні яны зарабілі 216 руб. апрача працадзён.

ФРАЛОЎ.

СВАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ВЫКАНАЮ

Я абавязаўся ў гэтым годзе ўбрать паўднёвым камбайнам 500 гектараў. Першыя дні работы паказалі, што сваё абавязацельства я выканаю.

Камбайн я атрымаў спраўны. Да пачатку работы добра вывучыў яго і ўвёў некаторыя ўдасканаленні. Так, я апусціў жнейку ніжэй на 12 сантыметраў. Гэта забяспечвае мне чыстую ўборку.

Прыехаў у калгас «Комінтэрн», Рубілкаўскага сельсовета. Тут камбайн паявіўся ўпершыню. Калгаснікі вельмі задаволены яго работай, чыстай уборкай. Дырэкцыя МТС дала мне добры трактар «ХТЗ». Нават з поўным бункерам хлеба камбайн добра ідзе па гарыстых участках.

Старшыня калгаса тав. Кулікоўскі замацаваў за камбайнам аўтамашыну, якая на ходу выгружае бункер. Першыя дні я ўбіраю па 11—12 га.

Але ёсць і недарэчнасці. У трэці дзень уборкі я пераязджаў з участка на ўчастак. Жыта паспявае на ўсім масіве і кіраўніцтва калгаса хоча ўбраць на ўсіх участках адначасова.

Гаручае, змазачнае і вада не перасоўваюцца ўслед за камбайнам. Гэта таксама перашкаджае маёй рабоце.

Мяне вельмі цікавіць, як ідзе работа майстра камбайнавай уборкі Путчынскай МТС т. Ермалкевіча, з якім я спаборнічаю. Добра было-б, каб праз газету «Звязда» камбайнеры і камбайнеркі інфармавалі аб сваёй рабоце.

Ураджай у гэтым годзе значна лепшы мінулага. Умовы для работы мне сёлета створаны лепшыя. Дырэктар МТС т. Мінін штодзённа наведвае мяне. Маёй работай цікавіцца кіраўніцтва раёна.

ШУМСКІ Канстанцін,
майстар камбайнавай уборкі Дзержынскай МТС.

АБ ДРЭННАЙ УБОРЦЫ І ДАБРАДУШНАСЦІ БАРЫСАЎСКІХ КІРАЎНІКОЎ

Больш дзесяці дзён ідзе ўборка зернавых культур у Барысаўскім раёне. Тэмпы ўборкі вельмі нізкія—на 20 ліпеня сабрана ўсяго 21,6 проц. зернавых культур. Раён уступіў ва ўборку яўна непадрыхтаваным.

У калгасе «Палітаддзелец» убрана толькі 100 гектараў азімага жыта з плошчы ў 276 гектараў. Прычына дрэннага ходу ўборкі ў нездавальняючай арганізацыі працы. Індывідуальная здзельшчына адсутнічае. Калгаснікі ў двух брыгадах працуюць разам. Брыгадзіры не па выпрацоўцы, а па свайму погляду, «на-вока» вызначаюць, колькі каму запісаць працадзён і хто працуе па-стаханаўску.

Толькі 22 ліпеня вышаў на поле гэтага калгаса паўночны камбайн Прыямінскай МТС. Да камбайнавай уборкі МТС не падрыхтавалася. У калгасе цяпер толькі пачалі будаваць зернасушылку. А сушыць збожжа, якое паступае ўжо з-пад камбайна, няма дзе. Вінаўнікі, сарваўшыя будаўніцтва сушылкі, не выкрыты. У гэтым-жа калгасе збожжа мяркуюць малаціць на полі, няма крытых павеней.

У калгасе «Новае жыццё» на камбайне першы год працуе калгасніца Надзя Патапёнак. Яна перавыконвае сутачныя нормы выпрацоўкі. Але яе камбайн не забяспечан запаснымі часткамі, не арганізавана абкошванне вуглоў на полі, што прыводзіць да лішніх прабегаў.

Вельмі моцны ў раёне антымеханізатарскія тэндэнцыі. Пад выглядам барацьбы са стратамі ў калгасе «14-годдзе Кастрычніка» жняркі паставілі пад павець, а жнуць сярпамі. У калгасе «Новае жыццё» 4-ма жняркамі ўбрана 40 гектараў. Спасылаюцца, што быццам пасля жняркі астаюцца на полі каласы. А тым часам машыны пушчаны без зернаўлавіцеляў.

Райком партыі выпусціў з-пад сваёй увагі кіраўніцтва ўборкай. Яшчэ залоўга да ўборкі ў райкоме была прынята многаслоўная рэзалюцыя, у якой з пахвальнай старанасцю былі перапісаны амаль усе пункты з адпаведнай пастановы СНК і ЦК. Прайшло шмат часу. Ёсць не мала фактаў нядобраякаснай уборкі. У раёне сарвана будаўніцтва сушылак, павецей, асцяней, зацягваецца цераблене ільну, не пачата малаціба і т. д. Аб усім гэтым у райкоме, райвыканкоме захоўваюць маўчанне.

У раёне вельмі мала зроблена ў справе ліквідацыі вынікаў варожай дзейнасці трацкісцка-бухарынскага ахвосця. Абмяжоўваюцца дэкларацыямі, закліканнямі, а не арганізоўваюць практычнай барацьбы за выкананне ырэктыў партыі і ўрада аб уборцы.

Н. ГЛУХ.

ЖНЯЯРКІ СТАЯЦЬ, А ЖНУЦЬ СЯРПАМІ

ЛЮБАНЬ. Калгасы раёна разгарнулі масавае збіранне ўраджаю і здачу збожжа дзяржаве.

У калгасе «Дружба», Гарадзячыцкага сельсовета, ужо зжата 250 гектараў. 115 гектараў зжата жыта ў калгасе «Чырвоная зорка». Тальскага сельсовета. 2-я брыгада гэтага калгаса першай на Слуцкай акрузе атрымала першы квіток па здачы збожжа дзяржаве, здаўшы 620 кілограмаў.

Калгас «Чырвоны комунар», Яменскага сельсовета, закончыў жніво жыта на плошчы ў 170 гектараў.

Больш высокія нормы выпрацоўкі на жніве даюць калгасніцы сельгасарцелі «Чырвоная ветка», Рачэнскага сельсавета, Зубкевіч Такля, Пархімовіч Антоля, Пархімовіч Жэня, якія выжынаюць кожная па 30—35 сотых гектара за дзень, пры норме ў 09 сотых.

Але-ж жняркі на ўборцы ў многіх калгасах скарыстоўваюцца дрэнна. Тут патураюць антымеханізатарскім настроям. Так, за ўсіх калгасах Турапскага сельсавета жняркі стаяць, а збожжа жнуць уручную. У калгасе «Пролетарый», Рачэнскага сельсавета, жняркі працуюць без зернаўлавіцеляў. Снопавязалка Любаньскай МТС увесь час прастойвае з-за неспраўнасці. Прастойвае снопавязалка і ў калгасе «Серп і молат».

М. ДАСТАНКА.

ПАДАЗРОНАЕ МАЎЧАННЕ

26 чэрвеня «Звязда» ў артыкуле «У палоне ў класавага ворага» пісала, што ў Інстытуце прамысловасці Наркаммяспрома адбываюцца агідныя справы, якія мяжуюць са шкодніцтвам, што апарат вельмі засмечан класава-варожымі элементамі, людзьмі, якія былі ў вельмі блізкіх і пры язных сувязях з трацкісцкім выродкам Слонімам, фактычна дапамагалі яму, ў шкодніцкай рабоце, што дырэктар Тужыкаў пакрываў ворагаў, што Наркаммяспром, і асабіста тав. Балпін, не заняўся інстытутам нават пасля выкрыцця там групы шкоднікаў.

Прайшоў месяц з часу апублікавання артыкула ў «Звязде». Але-ж і да сучаснага моманту нарком тав. Балпін упарта адмоўчваецца і ніякіх мер не прымае да аздараўлення атмасферы ў інстытуце. Праўда, тав. Балпін вылучыў камісію для праверкі становішча ў інстытуце. Яна даўно скончыла работу, але рэзультатаў усё яшчэ не відаць. Ствараецца ўражанне, што камісія вылучана для таго, каб адцягнуць час і змазаць пытанне.

Прысланае ў рэдакцыю, да-рэчы толькі праз 25 дзён пасля змяшчэння артыкула, пісьмо сакратара парткома інстытута тав. Ліўшыца сведчыць аб тым, што і інстытуцкія арганізацыі нічога яшчэ практычна не зрабілі па рашучай ліквідацыі рэштаў шкодніцтва, што партком і яго сакратар тав. Ліўшыц займаюцца пустой, нікому непатрэбнай алілуйшчынай.

Партсход інстытута прызнаў артыкул у «Звязде» правільным і даручыў парткому правесці вал практычных мерапрыемстваў, у прыватнасці, дэтальна расследаваць сур'ёзныя абвінавачанні супроць дырэктара Тужыкава і загадчыка сектарам будматэрыялаў Дулевіч. Прайшло больш трох тыдняў, а партком усё яшчэ збіраецца заняцца гэтай справай.

Няўжо не зразумела тт. Балпіну і Ліўшыцу, што такія іх «барацьба» з рэштамі шкодніцтва толькі на-руку ворагам?

ВЫБАРЫ, ЯКІЯ НЕАБХОДНА АДМЯНІЦЬ

Справаздачна-выбарчы сход профсаюзнай арганізацыі Высачанскай МТС (Лёзнянскі раён) склікаўся два разы, але і ў апошні раз на сход з'явіўся ўсяго 21 чалавек, замест неабходных 32, г. зн. менш 75 проц. агульнай колькасці выбаршчыкаў. Рабачком не здолеў забяспечыць падрыхтоўку схода і ў першы і ў другі раз. Сход пачаўся са спазненнем на 5 гадзін (замест 4 гадзін дня—у 9 гадзін вечара), прайшоў вяла, без разгорнутай крытыкі і самакрытыкі.

У справаздачы старшыня рабачкома Цітоў і ў выступленні дырэктар МТС Нароненка прабавалі за дрэнную работу рабачкома і дырэкцыі віну ўскласці на іншых. Замест прызнання сваіх памылак, яны падвергалі крытыцы радавых работнікаў МТС і абышлі маўчаннем работу кіраўнікоў і адказных работнікаў—агранома, механікаў. Ніхто з іх нават не напомніў аб фактах сваёй палітычнай бясклопатнасці і слепаты, праяўленай да нейкага Іванова, які падвізаўся ў МТС у якасці намесніка дырэктара па разліках. На працягу раду год Іванаў утойваў, што яго два браты ў 1920 годзе былі расстраляны за бандытызм, з якімі ён сам меў сувязь, перадаваў ім весткі аб месцазнаходжанні часцей Чырвонай Арміі.

Аб палітычнай бясклопатнасці, слепаце да Іванова з боку дырэктара МТС, рабачкома, аб справах Іванова на сходзе ніхто і не ўспомніў.

Выказалася ў спрэчках па справаздачы рабачкома і рэвізійнай камісіі ўсяго 5 чалавек. Старшыня схода, нам. дырэктара МТС па палітчасці Кантаровіч, не гледзячы на тое, што сходам рэгламент для спрэчак не быў устаноўлен, перапыняў выступаючых: «Карацей, карацей». І, відома, гэта адбівалася на ходзе спрэчак.

Выбары рэвізійнай камісіі і дэлегата на з'езд праведзены няверна, спехам. Кандыдатуры ў спісак для тайнага галасавання не абмяркоўваліся. Не было сказана ні слова ні «за» ні «супроць».

Гэтыя факты гавораць аб недапушчальных адносінах партарганізацыі МТС да правядзення профсаюзнага справаздачна-выбарчага схода. Гэтыя выбары павінны быць адменены і праведзены зноў.

В. Я. РЫМАН.

БОЛЬШЭВІЦКАМУ ДРУКУ— ВЕРНЫЯ ПАРТЫІ СТАЛІНСКІЯ КАДРЫ

Таварышу Сталіну належыць класічнае вызначэнне нашага друку, як самай моцнай, самай вострай зброі партыі. На ўсім працягу гераічнай гісторыі большэвізма комуністычны друк апраўдваў сваё высокае назначэнне, ён адыграў віднейшую ролю ў барацьбе за перамогу дыктатуры пролетарыята і таржаство социялізма ў нашай краіне, ён заўсёды быў магутным гарэнам, карыстаючыся якім наша партыя паспяхова граміла ўсіх ворагаў комунізма.

Высока цэнячы друкаванае слова, Ленін і Сталін самі кіравалі газетамі ў годы збірання і згуртоўвання сіл партыі і рабочага класа для штурму самадзяржаўя. У перыяд падрыхтоўкі да Вялікай Пролетарскай рэволюцыі. Бліжэйшым сваім саратнікам аўтарытэтным і верным большэвікам даручалі Ленін і Сталін кіраўніцтва газетамі.

Лютаўска-Сакавіцкі Пленум ЦК ВКП(б) з асаблівай сілай падкрэсліў ролю друкаванага слова. Пленум абавязаў партарганізацыі аднавіць значэнне справы прапаганды і друкаванага слова, укамплектаваць органы прапаганды і рэдакцыі газет лепшымі работнікамі і дабіцца таго, каб рэдактары газет уваходзілі ў склад кіруючай вярхушкі вобласці, края, горада, раёна. Гэта ў вышэйшай ступені важнае рашэнне многія партыйныя камітэты не выканалі. Яны выпусцілі кіраўніцтва газетамі з рук, аддалі іх на водкуп рэдактарам. Так было на Украіне, друк якой за апошні час падвяргаўся рэзкай крытыцы са старонак «Правды». «Комуніст»—орган ЦК КП(б)У, «Пролетарская правда»—орган Кіеўскага абкома—і некаторыя іншыя органы друку вялі сябе недастойна, ганьбячы высокае званне комуністычных газет.

Такое становішча не магло не выклікаць глыбокага абурэння нашай грамадскасці. Партыйныя і беспартыйныя чытачы сігналізавалі аб тым, што лінія гэтых газет—замаўчванне важнейшых палітычных пытанняў, нежаданне змагацца з ворагамі народу—не выпадкова. Яны пісалі, што гэта вынік засмечанасці рэдакцый варожымі элементамі. Сігналы далкам пацвердзіліся. У рэдакцыях «Комуніста», «Пролетарской правды» і некаторых іншых газет развярушаны гнёзды ворагаў народу—мярзотных шпіёнаў і здраднікаў радзімы.

Святы доўг любога партыйнага кіраўніка—уважліва сачыць за кожным нумарам сваёй газеты, рэагаваць на кожную яе памылку, ведаць, хто робіць газету. Пладатворна выступаць на журналісцкім полі дзейнасці, паспяхова працаваць у нашай прэсе можа толькі той, хто да канца, да апошняй кроплі крыві аддан справе Леніна—Сталіна. Толькі верны сын Сталінскага Цэнтральнага Камітэта і совецкага Урала, партыйны або непартыйны большэвік, мае права насіць высокае званне совецкага журналі

ЯПОНЦЫ РЫХТУЮЦЬ НОВУЮ ПРАВАКАЦЫЮ У ПАУНОЧНЫМ КІТАІ

Японскія ваенныя ўлады ў Паўночным Кітаі, пад повалам ваенных падрыхтовак, якія нібыта вядуцца кітайскім урадам, прадаўжаюць аказваць узмоцнены ціск на кітайскія ўлады, рыхтуючы новыя акты агрэсіі. Становішча зноў прыняла трывожны характар.

Прадстаўнік японскага штаба ў Цяньцзіне заявіў: «Становішча моцна змянілася да горшага з тае прычыны, што 37-я дывізія спыніла адыход з Бэйпіна, а 10 дывізій войск цэнтральнага ўрада, сканцэнтраваных у Хэбэі, прадаўжаюць ваенную падрыхтоўку».

Японцы афіцыяльна абмаўляюць, што яны далі абяцанне эвакуіраваць Люкоуцзяо адначасова з кітайскімі войскамі.

Рух па Бэйпін-Ханькоўскай чыгунцы 24 ліпеня вечарам быў зноў спынен з тае прычыны, што японскія войскі рабілі вобыскі ў паязадах.

23 ліпеня ў Кітай прыбылі два параходы з боепрыпасамі і часцямі 10-й японскай дывізіі. Боепрыпасы для японскіх войск безупынна адпраўляюцца з Цяньцзіня на захад, у прыватнасці ў Фынтай (вузлавая чыгуначная станцыя на поўдзень ад Бэйпіна, якая мае вялікае стратэгічнае значэнне).

Кітайскія газеты ўказваюць, што японскія войскі не робяць нічога для эвакуацыі з раёна Люкоуцзяо, а наадварот, узмацняюць свае ваенныя падрыхтаванні. Цяперашняе становішча лічыцца больш сур'ёзным, чым яно было перад пачаткам падзей у Люкоуцзяо. Газета «Дагунбао» заяўляе, што японцы не задаволяцца эвакуацыяй кітайскіх войск і будуць патрабаваць поўнага ліквідавання антыяпонскага руху ў Кітаі.

Другая газета—«Чжоубао»—указвае на ліхаманкавыя ваенныя падрыхтаванні японцаў на Поўначы Кітая і на падрыхтоўку новага ваеннага ўрывання ў правінцыі Чахар і Суйюань. (БЕЛТА).

***

БЭЙПІН (б. сталіца Кітая), 24 ліпеня (БЕЛТА). 23 ліпеня з Бэйпіна на поўдзень адправіліся тры поезды з кітайскімі войскамі, агульнай колькасцю ў 2 тыс. чалавек. Часці Чжао Тань-ю пачалі прыбываць у горад. Японскі ваенны разведэт у Бэйпіне Імаі ў гутарцы з прадстаўнікамі друку пацвердзіў, што японскія войскі астаюцца ў раёне Люкоуцзяо на сваіх пазіцыях і заявіў, што эвакуацыя іх залежыць ад таго, ці будуць выведзены войскі нанкінскага ўрада з правінцыі Хэбэй. Невялікія атрады японскіх войск свабодна раз'язджаюць паміж японскімі казармамі ў дыпламатычным квартале горада Бэйпіна і раёнам Люкоуцзяо, чаго раней кітайскія ўлады не дапускалі.

Японскія войскі прадаўжаюць рабіць умацаванні ўздоўж лініі фронта. Над гарадамі правінцыі Хэбэй штодзень лятаюць японскія самалёты, якія наведваюць таксама Чжанчжоў і іншыя пункты басейна Жоўтай ракі.

Агенцтва Сэнтраль Н'юс паведамляе, што 4-я, 5-я, 6-я, 10-я, і 16-я японскія дывізіі, а таксама дзве дывізіі ў Кареі атрымалі загад адправіцца ў Паўночны Кітай. Дзве дывізіі Квантунскай арміі сканцэнтраваны на граніцах правінцыі Жэхэ.

***

ШАНХАЙ (буйны прамысловы горад Кітая), 24 ліпеня (БЕЛТА). Янь Сі-шань (старшыня ўрада правінцыі Шаньсі) выдаў загад аб узмацненні абароны правінцыі Суйюань. Меры перасцярогі прымаюцца ў сувязі з абстаноўкай, якая стварылася ў Паўночным Чахары, дзе сканцэнтраваны 4 брыгады манчжурскай рэгулярнай казалерыі. 23 ліпеня ў Тайюані (сталіца правінцыі Шаньсі) адбылася скліканая Янь Сі-шанем нарада вышэйшага каманднага складу войск, размешчаных на граніцы правінцыі Суйюань. На гэтай нарадзе Янь Сі-шань інструктаваў вышэйшы камандны склад па пытаннях абароны правінцыі.

НАНКІНСКІЯ ВОЙСКІ ПРАСОЎВАЮЦЦА НА ПОЎНАЧ

ТОКІО (сталіца Японіі), 23 ліпеня. (БЕЛТА). Усе газеты прыводзяць паведамленні з Бэйпіна і Тяньцзіня, якія ўказваюць, што нанкінскія войскі прадаўжаюць прасоўванне на поўнач і што ноччу 21 ліпеня ў Хунмэйпянь, каля Хуанцуна, які знаходзіцца за некалькі міль ад Фынтая, з поўдня нечакана прыбыла звыш тысячы кітайскіх салдат з 16-цю палявымі гарматамі і 40 кулямётамі.

ПЛАНЫ ЯПОНСКАЙ РАЗВЕДКІ

ШАНХАЙ. 24 ліпеня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення газеты «Шанхай іўнінг пост», японская ваеншчына ў Паўночным Кітаі прабуе правесці ў жыццё план вяломага японскага разведчыка генерал-лейтэнанта Даіхара, які прадугледжвае пашырэнне «Ўсходне-Хэбэйскай аўтаномнай антыкамуністычнай дзяржавы» з уключэннем у яе палкам правінцый Хэбэй і Чахар. Японскія ваенныя ўлады замышляюць аказаць новы націск на кітайскія ўлады ў Паўночным Кітаі для таго, каб дабіцца адлучэння правінцый Чахар і Хэбэй ад нанкінскага ўрада. Яны таксама дабіваюцца знятня антыяпонска настроеных членаў хэбэй-чахарскага палітычнага совета і назначэння старога японскага агента Шы Ю-сяна старшынём хэбэйскага правінцыянальнага ўрада і мэрам горада Бэйпіна.

ПАДРЫХТОЎКА ЯПОНСКАЙ ПРАВАКАЦЫІ СУПРОЦЬ СОВЕЦКАГА ГЕНЕРАЛЬНАГА КОНСУЛЬСТВА Ў ШАНХАІ

ШАНХАЙ. 25 ліпеня. (БЕЛТА). Па вестках з верных крыніц, японская разведка рыхтуе правакацыю супроць совецкага генеральнага консульства ў Шанхаі. Для гэтай мэты японцы пераправілі з Манчжурыі ў Шанхай групу рускіх белабандытаў. Японцы ўзброілі гэтых бандытаў і, каб замесці сляды, снабзілі частку з іх фальшывымі совецкімі пашпартамі. У сучасны момант гэтыя бандыты пад кіраўніцтвам японскай разведкі рыхтуюць налёт на совецкае генеральнае консульства.

Камандзір адной з часцей рэспубліканскай арміі Іспаніі абыходзіць лініі рэспубліканскіх войск. Фото СФ.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

НА МАДРЫДСКІМ ФРОНЦЕ ЛЮТЫЯ БАІ ПАД БРУНЕТЭ

24 ліпеня на цэнтральным фронце ў Іспаніі разгарнуліся лютыя баі ў раёне населішча Брунетэ, на захад ад Мадрыда. Інтэрвенты і мяцежнікі сканцэнтравалі на гэтым участку на працягу апошніх двух дзён буйныя ваенныя сілы і вялікую колькасць ваеннага снаражэння.

Раніцаю 24 ліпеня, пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі, пяхота фашыстаў, спераду якой ішлі танкі, павяла наступленне на лініі рэспубліканскіх войск. Рэспубліканская артылерыя, падтрымліваемая дзеяннямі авіяцыі, адказвала на атаку мяцежнікаў. Лютыя баі адбываліся на працягу ўсёй раніцы. Усе спробы мяцежнікаў уступіць у Брунетэ не мелі поспеху і суправаджаліся велізарнымі стратамі для іх. Рэспубліканскія войскі ўтрымлівалі ўсе свае пазіцыі. Баі, якія вызначаліся надзвычайнай лютасцю, прадаўжаліся ўвесь дзень 24 ліпеня.

Пасля ўзмоцненай артылерыйскай падрыхтоўкі і пры моцным падтрыманні авіяцыі мяцежнікам удалося пасля поўдня наблізіцца да першых дамоў у Брунетэ. Рэспубліканскія войскі разгарнулі ярасную контратаку, у рэзультаце якой праціўнік адступіў амаль да сваіх зыходных пазіцый. Пасля гадзіннай артылерыйскай падрыхтоўкі атака мяцежнікаў, падтрымліваемая вялікім лікам танкаў, адновілася. Пад моцным агнём праціўніка рэспубліканскія войскі вымушаны былі адступіць, пакінуўшы вёску Брунетэ. Аднак, прадпрыняўшы абходны рух, рэспубліканскія войскі пасля жорсткай контратакі зноў уступілі ў Брунетэ, адціснуўшы праціўніка і заняўшы паўночную палову вёскі. Лютыя баі вяліся на вуліцах вёскі за кожны асобны дом і прадаўжаліся ноччу. Канчатковыя рэзультаты пакуль яшчэ невядомы.

23 ліпеня рэспубліканская авіяцыя на Ўсходнім (арагонскім) фронце бамбардыравала аэрадромы, чыгуначныя станцыі і рад іншых ваенных аб'ектаў мяцежнікаў. Бамбардыроўцы падвергліся вакзал Кальсада дэ Оронеса (на захад ад Талаверы), вакзал і ваенныя склады ў Талаверы, а таксама аэрадромы ў Авіле, Эскалоне і ў Альмароксе, дзе знаходзілася шэсць самалётаў, якія пацярпелі ад бамбардыроўкі.

МАСКВА—СЕВАСТОПАЛЬ—МАСКВА

ПАВЕТРАНЫЯ ГОНКІ СПАРТЫЎНЫХ САМАЛЁТАЎ

МАСКВА, 25 ліпеня (БЕЛТА). 24 ліпеня на досвітку на Тушынскім аэрадроме 19 прыгожых самалётаў выстраіліся ўдоўж стартазай лініі ўзлёту шарэнгай. На аэрадром прыбылі лётчыкі—ўдзельнікі першых у СССР хуткасных гонак.

***

З ліку вылецеўшых з Тушынскага аэрадрома ўдзельнікаў хуткасных спаборніцтваў спартыўных самалётаў па маршруту Масква—Севастопаль — Масква агульнай працягласцю 2.815 кілометраў вярнуліся ў Маскву ў той-жа дзень 9 самалётаў. З іх вытрымалі поўнасцю ўмовы спаборніцтваў 5 самалётаў. Астатнія самалёты, якія асталіся ў дарозе з-за позняга часу, начуюць на розных аэрадромах трасы палёту.

Лепшыя рэзультаты на алнамесных самалётах паказалі: лётчык тав. Дымаў—на самалёце «УТ-1» з маторам «М-11-Е» магутнасцю ў 150 конскіх сіл і лётчык тав. Ільін на самалёце «УТ-1» з маторам «М-11» магутнасцю ў 100 конскіх сіл.

СВЯТА ЧЫРВОНАСЦЯЖНАЙ ДЫВІЗІІ

Раніцой 24 ліпеня ў лагер Чырвонасцяжнай беларускай імя М. В. Фрунзе стралковай дывізіі пачалі прыбываць гостралковай дывізіі пачалі прыбываць госці — працоўныя горада, каб разам з байцамі і камандзірамі адсвяткаваць юбілей слаўнай дывізіі. Аднымі з першых гасцей лагера былі старшыня ЦВК БССР тав. Стакун, старшыня СНК БССР тав. Валковіч, сакратар гаркома КП(б)Б тав. Лігвін, старшыня горсовета тав. Кудзельскі.

19 год назад у агні грамадзянскай вайны нарадзілася дывізія. Пад пераможным кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна дывізія ўпісала шмат слаўных старонак у гісторыю незабываемых баёў за Рэспубліку Саветаў на Ўсходнім і Заходнім франтах.

Свята захоўваючы баявыя традыцыі, памяць аб гераічных подвігах у гады грамадзянскай вайны, байцы і камандзіры дывізіі, не шкадуючы сіл, працуюць над сваім баявым удасканаленнем. Авалодваючы большэвізмам, завастраючы рэвалюцыйную пільнасць, непрымірыма і бязлітасна выкрываючы ворагаў, байцы і камандзіры высока падымаюць сцяг соцыялістычнага спаборніцтва, узмацняючы абаронную моц РСЧА. Бліскучым доказам гэтаму быў дарад часцей дывізіі, якім пачалося свята.

Адбіваючы крок, шчэпіячыся лесам штыкоў, міма трыбун у строгім страю прайшлі батальёны пяхоты. Іх моцны поступ, спакойны, упэўнены крок былі ўнушальным доказам страявой згуртаванасці і высокай вывучкі падраздзяленняў.

Пасля адпачынку і абеда дывізіі, на прыгожа ўбраным стадыёне адбыліся масавыя спартыўныя выступленні.

Свята закончылася паказам чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці.

Бодрую зарадку, рашучасць яшчэ ўпарцей штурмаваць высоты баявой падрыхтоўкі, каб апраўдаць увагу і любоў працоўных, даў юбілей байцам і камандзірам.

П. ВАЛЬД.

Растлумачэнне Наркамзема СССР

Наркамзем СССР растлумачвае дырэктарам машынна-трактарных станцый і соўгасаў сістэмы Наркамзема аб тым, што натуральная павіннасць машынна-трактарных станцый і соўгасаў па ўдзелу ў дарожным будаўніцтве адмяняецца.

На 1937 год сетка машынна-дарожных атрадаў захоўваецца толькі пры бураковых машынна-трактарных станцыях у колькасці 400 атрадаў, з наступным размеркаваннем: Украіна—270, Варонежская вобласць — 35, Курская — 46, Азова-Чорнамор'е — 15, Заходне-Сібірскі край—25, Казахская ССР, Кіргізская ССР і Далёка-Ўсходні край—па 3.

Усе раней арганізаваныя ў машынна-трактарных станцыях і соўгасах машынна-дарожныя атрады, апрача вышэйўказанай колькасці, павінны быць неадкладна ліквідаваны.

Маючыйся ў машынна-дарожных атрадах спецыяльны дарожны інвентар (грэйдары, каткі, трактарныя і конныя лапаты, дарожныя канавакапацелі і ўпогі) перадаецца мясцовым дарожным аддзелам безвазмезна.

У далейшым машынна-трактарныя станцыі, дзе забараняецца арганізацыя машынна-дарожных атрадаў, могуць заключаць дарожныя работы толькі па дагаварах, заключаных з дарожнымі аддзеламі, калгасамі і іншымі арганізацыямі пры ўмове аплаты гэтых работ толькі па сабекаштоўнасці. Вытварэнне дарожных работ машынна-трактарнымі станцыямі за лік сваіх сродкаў катэгарычна забараняецца (ТАСС).

ПАВЕДАМЛЕННІ

СПІС ВЫКЛІКАНЫХ НА БЮРО ЦК КП(б)Б НА 27 ЛІПЕНЯ 1937 г.

Басін Л. Ш., Серыкаў Е. Д., Рудкоўскі М. Г., Рудзенка Н. Л., Махнач А. В., Шымко Ф. С., Савінкаў І. А., Кавалёў З. В., Кавалёў В. А., Ткач Г. М., Сямёнаў І. І., Стасенка І. С., Малкін Я. І., Цімашкоў Н. Е., Барада Л. А., Левін І. О., Гуцаў Х. К., Якаўлеў І. К., Луцкі В. Ф., Папукоў Н. Р., Зайцаў Е. М., Шмоткін І. З., Сукеннік А. Ю., Якаўлеў А. П., Літвіноў М. Я., Саколіна Л. Д. (Гомель); Брэслаў М. І., Хает Я. С., Грынгауз А. А. (Сталінскі горраён), Суліма У. І. (Глуск), Арлоўскі Н. І. (Віцебск), Дарманоўскі М. І. (Барысаў), Алесік С. Р. (Капаткевічы), Гарбачэўскі З. Н. (Віцебск), Пікулін Б. Г. (Асіповічы), Метор С. Ю. (Кагановіцкі горраён), Ліўшыц Х. І. (Глуск), Глінскі Б. С. (Бягомль), Гуткін С. Ш., Урбановіч А. Ф. (Кагановіцкі горраён — Орша), Кіслоў І. М. (Менск, сельраён), Мендзелевіч С. Л. (Варашылаўскі), Каско А. А. (Дзержынск), Гурылёнак Я. Ф. (Сянно), Дзергачоў Я. А. (Глуск), Змачынскі Я. А. (Ветка), Вязановіч Ю. В. (Мазыр), Нарэска Ю. Н. (Віцебск), Карпіловіч Н. Е. (Варашылаўскі горраён), Царык А. В. (Бабруйск), Лапухоў П. Д. (Віцебск), Венгерык М. А., Фурман І. А. (Бабруйск), Будкевіч В. Ф. (Віцебск), Вайновіч Н. Ф., Грыф Б. Е. (Барысаў), Капшук Д. В. (Бялынічы), Жалкевіч М. Е. (Барысаў), Манько Л. О. (Парычы), Шнакоўскі К. І. (Рэчыца), Ліпкін А. Н. (Магілеў), Федарынчык І. М. (Пухавічы), Правала М. М. (Бешанковічы), Бобрыкаў А. С. (Старобін), Габаў І. М. (Кіраў), Грышчэнка Е. Д. (Клімавічы), Спаткай П. Ф. (Талочын), Усовіч Б. Ф. (Барысаў), Рабіннікаў М. М. (Дрыбін), Цыганкоў А. Е. (Слуцк), Славінскі І. А., Спектар М. (Мазыр), Жабаро А. І. (Сіроціна), Безлюдаў С. Е. (Віцебск), Напраёў Ф. Г. (Магілеў), Кастромін (Дзержынск), Слесарова М. Ф. (Жлобін), Красоўскі І. А. (Сталінскі горраён), Нагліс К. М. (Жлобін), Рудзенка В. І. (Горкі), Давідовіч (Варашылаўскі), Паланецкі В. Г. (Парычы), Алейнікаў Т. М. (Горкі), Сагаловіч Н. І., Бокун М. М., Кашкан А. І. (Сталінскі горраён), Пятроў М. А. (Кагановіцкі горраён), Аўруцін Г. М. (Полацк), Філіпчук А. В. (Менск—сельраён), Гуревіч К. Х. (Бабруйск), Давідовіч Р. Г. (Кагановіцкі горраён), Альшэўская А. С. (Лепель), Юркоў І. Ф. (Будакашалёва), Шалкоўскі С. Н. (Асіповічы), Гельфанд Е. А. (Менгарком), Багуза П. П. (Орша), Царэшчанка Ф. В. (Смалявічы). Кацнельсон Е. М. (Жлобін), Сідорык І. Я. (Варашылаўскі), Мерлін А. І. (Орша), Паўлавец В. Т. (Менгарком), Васілюк Н. Н. (Орша), Кульш П. Е. (Барысаў), Тарасевіч З. Н. (Орша), Батус А. Г., Булойчык Ф. В., Тумін М. Я. (Менгарком), Пучкоўскі Н. К. (Віцебск), Міцкевіч Н. П. (Каспіковічы), Забродскі А. Ф. (Менгарком), Наталовіч І. А. (Расоны).

ОРПО ЦК КП(б)Б.

Сёння, 26 ліпеня 1937 г., а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканні клуба імя Сталіна

АДБУДЗЕЦЦА

ПРАЦЯГ ПАСЯДЖЭННЯ ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ.

Яўка членаў і кандыдатаў горсовета абавязкова.

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Беларускага дзяржаўнага драмтэатра — гастролі Маскоўскага тэатра імя МОСПО

ПРАФЕСАР МАМЛОК

Пачатак у 8 г. веч.

Білеты ў касе тэатра з 12—2 і з 5 г. веч.

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка» МАЛЕНЬКАЯ МАМА

Дзіцячы гукавы кінатэатр ЛЕНАЧКА І ВІНАГРАД

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» КРЫЛАТЫ МАЛЯР

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал» ЖАНІЦЬБА (па Гогалю)

Гукавы кінатэатр «Спартак» КАМЕРА № 79 (нямы варыянт)

ДЗЯРЖЦЫРК

Парк імя Горкага (тэл. 22.725)

Гастролі адзінай жанчыны ў СССР—ілюзіяністкі

Клео ДАРОЦІ

і яе 15 асістэнтамі-ліліпутамі.

7 — МОРЭНО — 7

веласіпедысты-фігурысты

Таксама ўдзельнічае ўся трупа

Пачатак у 9 гадзін веч.

Каса з 12—2 і з 5 гадз. веч.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 26 ЛІПЕНЯ: 8.30—«Апошнія паведамленні». 10.05—перадача для хатніх гаспадынь. 17.00—перадача для дашкольнікаў. 17.15—перадача для малодшых школьнікаў. 18.30—завочная партыўчоба. 19.45—украінскія народныя песні. 20.00—даклады і выступленні. 20.15—аграгутарка. 20.30—мантаж оперы «Фіялка Манмартра». 21.30—перадача на польскай мове. 22.00—канцэрт. 23.00—«Апошнія паведамленні».

Белдзяржтэатру оперы і балета ПАТРЭБНЫ ПАКОІ для прыязджаючых акторaў. Плата па згодзе. З прапановамі зварачацца па адрасу: пог Урыцкага і Карла Маркса, 13/15, да дзяжурнага, тэл. 21-834.

Выдавецтву газеты «Звязда» ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА. Звяртацца: Совецкая, 63, II паверх.

ПАМЯШКАННЕ ЯЎРЭЙСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА БССР

З 29 ЛІПЕНЯ ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА ПОЛЬСКАГА ТЭАТРА УССР

РЭПЕРТУАР:

А. ФРЭДРО ДАМЫ І ГУСАРЫ

Ф. ШЫЛЕР РАЗБОЙНІКІ

Ю. СЛАВАЦКІ МАЗЕПА

Г. ЗАПОЛЬСКАЯ МАРАЛЬ ПАНІ МАДУЛЬСКАЯ

ЛОПЕ-ДЭ-ВЕГА САБАКА НА СЕНЕ

Папярэдні продаж білетаў у касе Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра з 11 да 2 г. і з 5 гадзін вечара.

Хіміка-фармацэўтычная фабрыка ГАЛЕК-МАСКВА

ПРАПАНУЕ

СКЛАДАНЫ СІНТЭТЫЧНЫ ЭФІР

БУЦІЛ-АЦЭТАТ,

упаўне замяняючы АМІЛ-АЦЭТАТ як растваральнік лакаў, смол, цэлулоіда і т. п. (Дае бліскучую паверхню).

Патрабаванні накіроўваць па адрасу: Москва, Бахметьевская ул., 2-й Вышеславцев пер., дом № 6.

МАГІЛЕЎСКАЯ ФЕЛЬЧАРСКА-АКУШЭРСКАЯ І ФАРМАЦЭЎТЫЧНАЯ ШКОЛЫ

(былы медполітэхнікум),

якія рыхтуюць фельчароў, акушэрак і памочнікаў правізараў,

АБВЯШЧАЮЦЬ АСЕННІ НАБОР СТУДЭНТАЎ

на 1937—38 навучальны год на наступныя аддзяленні:

1. Акушэрскае з 2-гадовым курсам навучання — 270 асоб.
2. Фельчарскае з 3-гадовым курсам навучання — 330 асоб.
3. Фармацэўтычная школа з 3-гадовым курсам навучання — 120 асоб.

Прыём заяў праводзіцца з 20 чэрвеня па 1 жніўня.

Да заяў трэба прыкласці наступныя дакументы (абавязкова ў арыгіналах): 1) пасведчанне аб нараджэнні, 2) пасведчанне аб сканчэнні няпоўнай сярэдняй школы, 3) пасведчанне дзяржаўнай лячэбнай установы аб тым, што паступаючы не мае хвароб, перашкаджаючых для паступлення ў фельчарска-акушэрскую і фармацэўтычную школы, 4) дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, 5) аўтабіяграфію, засведчаную совецкімі або прафсаюзнымі арганізацыямі, 6) паштовых марак на 80 кап.

Заявы прымаюцца ад асоб ва ўзросце ад 15 да 35 гадоў.

На іспыты кожны падаўшы заяву будзе выклікан абавяскай і без паведамлення на іспыты не павінен з'яўляцца.

Іспыты адбудуцца з 1 да 20 жніўня па матэматыцы, фізіцы, грамадзянаўству, геаграфіі, беларускай і рускай мовах і літаратуры за курс няпоўнай сярэдняй школы.

Заняткі пачнуцца з 1 верасня 1937 г. Усе залічаныя ў фельчарска-акушэрскую і фармацэўтычную школы, якія маюць 16 год, абавязкова павінны з'явіцца на заняткі з пашпартам.

Усе прынятыя іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам, сталовай і пральняй.

Стыпендыяй вучні забяспечваюцца па паспяховасці ў памерах ад 60 да 90 рублёў.

Заявы накіроўваць на адрасу: гор. Магілеў, БССР, вуліца Карла Маркса № 1/12. ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРАВІЛЫ

прыёму ў Цэнтральную калгасную жывёлагадоўчую школу БССР на 1937-38 навучальны год

Цэнтральная калгасная школа ставіць сваёй мэтай падрыхтаваць нізавых спецыялістаў соцыялістычнай жывёлагадоўлі калгасных тэхнікаў-жывёлаводаў. Тэрмін навучання 12 месяцаў (10 месяцаў тэарэтычнай вучобы і два месяцы вытворчай практыкі).

Паступаючыя ў школу павінны адпавядаць наступным запатрабаванням: мець не менш аднаго года кіруючай працы ў калгасе: загадчыка фермы, брыгадзіра, старшыні калгаса. У школу прымаюцца лепшыя калгаснікі і калгасніцы — перадавікі вытворчасці, маючыя лепшыя паказальнікі ў рабоце: даяркі, свінаркі, конюхі і інш.

Агульная адукацыя паступаючых у школу павінна быць не ніжэй пачатковай школы або ведаў у гэтым абёме. Узрост паступаючых—ад 20 і не вышэй 40 год.

Адбор кандыдатаў у Цэнтральную калгасную жывёлагадоўчую школу праводзіцца ў спецыяльна складзенай пры райза адборачнай камісіі з прадстаўнікамі райза, МТС, РК КП(б)Б, РК КСМ. Адказнасць за выкананне развёрсткі ўскладаецца персанальна на загадчыкаў райза. Адборачныя камісіі павінны закончыць адбор кандыдатаў у школу да 15 жніўня. У складзе адборачных камісій павінна быць не менш 50 проц. жанчын. Усе камандыруемыя на вучобу павінны 15 жніўня з'явіцца на іспыты на адрасу: М. Копысь, Аршанскі раён, БССР, ЦЖКШ, і мець пры сабе наступныя дакументы: пастанову агульнага схода калгаса аб пасылцы на вучобу, камандыроўку райза, даведкі аб здароўі і аб адукацыі.

Іспыты адбудуцца з 15 па 30 жніўня. Пачатак заняткаў 1 верасня. У ЦЖКШ слухачы забяспечваюцца інтэрнатам, пасцельнымі прыладамі, падручнікамі і стыпендыяй ад 120 да 150 рублёў у месяц у залежнасці ад паспяховасці. Выдаткі на праезд у школу аплачваюцца за рахунак камандыруемага калгаса. Скончыўшыя школу накіроўваюцца на работу ў тыя-ж раёны, з якіх яны камандыраваны і працуюць не менш 2 год. Камандыраваныя на вучобу павінны мець пры сабе бялізну, пашпарт (абавязкова) і ўчотна-вайсковы білет.

Нам. наркома земляробства БССР БАРАНЧЫК.

Дырэктар ЦЖКШ ЗАРЭНІН.

НОВАБЕЛІЦКІ ПЕДРАБФАК

абвяшчае НАБОР студэнтаў

НА 1937-38 навучальны год.

На першы курс з адукацыяй НСШ, на другі курс — з адукацыяй 8 кл. СШ, на трэці курс з адукацыяй 9 кл. СШ.

На трэцім курсе ёсць яўрэйскае аддзяленне.

Пры рабфаку ёсць і вячэрняе аддзяленне, куды прымаюцца асобы без адрыву ад вытворчасці.

Умовы прыёму: паступаючыя трымаюць іспыты на першы курс — па беларускай і рускай мовах і матэматыцы (вусна і пісьмова), па беларускай і рускай літаратуры, геаграфіі і грамадзянаўству (вусна) у аб'ёме НСШ; на другі курс — па ўсіх прадметах 8 кл. СШ; на 3 курс — па ўсіх прадметах 9 кл. СШ.

Паступаючыя на 3 курс яўрэйскага аддзялення трымаюць іспыты і на яўрэйскай мове і літаратуры.

Усе паступаючыя павінны ведаць Сталінскую Канстытуцыю СССР і БССР.

Заявы з дакументамі — засведчаную аўтабіяграфію, метрыку, пасведчанне аб адукацыі, аб стане здароўя з дзвума фотакарткамі і марак на 20 кап. накіроўваць па адрасу: г. Новабеліца, Гомельскага раёна, Совецкая, 19, педрабфак.

Прыём заяў да 1 жніўня. Іспыты—з 20 па 27 жніўня. На рабфак прымаюцца асобы ва ўзросце ад 17 да 30 год.

Усе студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, а іншагароднія інтэрнатам.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Новабарысаўскі запалкавы тэхнікум

абвяшчае АСЕННІ НАБОР студэнтаў

на першы курс

Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-механікаў-тэхнолагаў для запалкавай прамысловасці СССР. Тэрмін навучання тры з паловай гады. Паступаючыя павінны мець веды не ніжэй няпоўнай сярэдняй школы. Іспыты па грамадазнаўству, мове, літаратуры, матэматыцы і фізіцы. Усе прынятыя ў тэхнікум і паспяхова навучаючыяся забяспечваюцца стыпендыяй, а іншагароднія інтэрнатам. Пры паступленні неабходна прадставіць наступныя дакументы: заяву з прыкладаннем кароткай аўтабіяграфіі, даведку аб нараджэнні, атэстат аб сканчэнні няпоўнай сярэдняй школы або 7 класаў сярэдняй школы, даведку аб стане здароўя, 2 фотакарткі. Пры сабе неабходна мець пашпарт. Прыём заяў да 10 жніўня. Іспыты з 10 па 20 жніўня. Пачатак заняткаў 1 верасня. Заявы накіроўваць па адрасу: БССР, Новабарысаў, Таварная вул., 27, запалкавы тэхні кум.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Марына-Горскі сельскагаспадарчы ТЭХНІКУМ

які рыхтуе агранамаў-паляводаў і садаводаў сярэдняй кваліфікацыі,

абвяшчае ПРЫЁМ студэнтаў

на 1937—38 навучальны год.

У тэхнікум прымаюцца грамадзяне абодвух палоў ва ўзросце ад 15 да 30 год, маючыя падрыхтоўку не ніжэй няпоўнай сярэдняй школы (семігодкі).

Прыём заяў да 25 жніўня.

Заяву з паказаннем, на якое аддзяленне паступаючы хоча быць прынят, падаваць на імя дырэктара тэхнікума.

Да заявы паступаючага прыкладаюцца наступныя дакументы:

Пасведчанне аб сканчэнні семігодкі (абавязкова з арыгінала); даведка аб здароўі; 2 фотакарткі з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, засведчаныя дзяржустановай.

Прыёмныя іспыты з 19 па 28 жніўня.

Усе паступаючыя падвяргаюцца прыёмным іспытам у аб'ёме няпоўнай сярэдняй школы: па беларускай мове і літаратуры, па матэматыцы, палітграмаце і фізічнай геаграфіі (па праграмах, устаноўленых НКЗ СССР).

Заявы падаваць па адрасу: БССР, п/а Марына-Горка, Марына-Горскаму с/г тэхнікуму.

Тэхнікум знаходзіцца пры чыгуначнай станцыі Пухавічы.

Усе залічаныя ў тэхнікум забяспечваюцца інтэрнатам і 75 процантаў прынятых — стыпендыяй.

ДЫРЭКЦЫЯ.

СМІЛАВІЦКІ ПАЛЯВОДЧЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ на 1 курс.

Тэхнікум рыхтуе АГРАНАМАЎ-ПАЛЯВОДАЎ сярэдняй кваліфікацыі

Тэрмін навучання 4 гады. У тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 30 год, якія маюць адукацыю ў аб'ёме НСШ.

Паступаючыя падвяргаюцца іспытам у аб'ёме праграм НСШ па беларускай мове і літаратуры, матэматыцы, фізіцы, фізічнай геаграфіі і палітграмаце. Асобы, скончыўшыя НСШ па адзначаных прадметах на «выдатна», прымаюцца без іспытаў.

Прыём заяў да 18 жніўня. Да заявы прыкладаюцца: аўтабіяграфія, пасведчанне аб сканчэнні НСШ (абавязкова арыгінал), метрыка, даведка аб здароўі, дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам, дзяржустановай і марак на 40 кап. Пашпарт прад'яўляецца асабіста.

Прыёмныя іспыты адбудуцца з 19 па 28 жніўня. Пачатак заняткаў з 1 верасня.

Прынятыя ў тэхнікум забяспечваюцца стыпендыяй у залежнасці ад курса і паспяховасці ад 55 да 90 руб., інтэрнатам і сталовай. Пры тэхнікуме ёсць вучобная гаспадарка.

Тэхнікум знаходзіцца ў 34 клм. ад гор. Менска. Маршрут паездкі: Менск, а з Менска аўтобусам да м. Смілавічы.

Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: п/а. Смілавічы, БССР, Смілавіцкаму паляводчаму тэхні куму.

ДЫРЭКЦЫЯ ТЭХНІКУМА.

Уп. Галоўлітбела № 1556. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. Б., К., С.